16+

Лім

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 35 (5244) 1 верасня 2023 г.

ISSN 0024-4686



Пляценне стужкі часу стар. 2




Каштоўны споведсказ стар. 6



Трэнд — ажурнае ткацтва стар. 13

# У госці да кнігі

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК




Калаж Кастуся Дробава.

*Мемарыяльная дошка ў гонар Канстанціна Вераніцына.*

Сталіца Дня беларускага пісьменства сёлета — Гарадок — невялікі горад у Віцебскай вобласці, што размясціўся на беразе ракі Гаражанка. Узнік ён на месцы старажытнага ўмацаванага паселішча, якое ў пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца ў другой палове XIII ст. у сувязі з бітвай паміж палачанамі і літоўскімі войскамі пад кіраўніцтвам князя Мінгайлы.

Што тычыцца літаратуры, то гэты рэгіён у першую чаргу асацыіруецца з постаццю аўтара знакамітага сатырычна-гумарыстычнага твора «Тарас на Парнасе» Канстанціна Вераніцына, які нарадзіўся ў вёсцы Астраўляны непадалёку ад Гарадка. Сёння паэму «Тарас на Парнасе» называюць «жамчужынай беларускай паэзіі», «адным з самых жыццярадасных і камічных твораў нацыянальнай літаратуры XIX стагоддзя». У 2001 годзе на радзіме паэта быў усталяваны валун у гонар паэмы і яе аўтара.

Славіцца Гарадок і сваёй нематэрыяльнай культурай. Мясцовае ткацтва «Кісяя» ўнесена ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны краіны. Паглядзець узоры абрусаў і ручнікоў, выкананых у мясцовай манеры, можна ў раённым краязнаўчым музеі, а таксама Гарадоцкім доме рамёстваў.

А ў першыя выхадныя верасня раённы цэнтр стане і кніжнай сталіцай нашай краіны. Пазнаёміцца з новымі выданнямі, сустрэцца з айчыннымі і замежнымі пісьменнікамі, журналістамі, выдаўцамі, паглядзець выступленні творчых калектываў і выканаўцаў дый проста акунуцца ў атмасферу добразычлівасці і ўрачыстасці змогуць усе, хто наведае гэты слаўны куток Віцебшчыны.

## «ЛіМ»-акцэнты

**Віншаванне.** Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку Беларусі Кацярыну Фадзееву з днём нараджэння. «Сваёй плённай творчай дзейнасцю вы ўнеслі выдатны ўклад у фарміраванне беларускай харэаграфічнай школы, захаванне і развіццё яе найлепшых традыцый, — адзначыў Кіраўнік дзяржавы. — Сёння вы шчодра дзеліцеся майстэрствам з маладымі артыстамі, служыце для іх узорам адданасці прафесіі. Упэўнены, вашы талент і шматгранны вопыт яшчэ доўгі час будуць садзейнічаць росквіту нацыянальнага мастацтва». Аляксандр Лукашэнка пажадаў Кацярыне Фадзеевай моцнага здароўя, дабрабыту і невычэрпнай энергіі.

**Адукацыя.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб ролі БДУ ў сістэме вышэйшай адукацыі краіны, аб стане і перспектывах развіцця ўніверсітэта. У БДУ Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з выстаўкай, на якой былі прадстаўлены ў тым ліку навуковыя распрацоўкі. Прэзідэнту паказалі таксама новы падручнік па беларускай дзяржаўнасці і анансавалі адпаведны атлас, які будзе ўкаранёны ў вучэбны працэс. Кіраўнік дзяржавы ў цэлым станоўча ацаніў распрацоўкі, прадстаўленыя на экспазіцыі. Падчас наведвання ўніверсітэта ён правёў нараду па актуальных пытаннях дзейнасці ВНУ. Аб сітуацыі ва ўніверсітэце далажыў міністр адукацыі. Андрэй Іванец адзначыў, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — буйны адукацыйны, навукова-даследчы і вытворчы комплекс. Там навучаюцца звыш 24 тысяч студэнтаў і магістрантаў, у тым ліку 4 тысячы замежных грамадзян з 62 краін. Адукацыйны працэс забяспечваюць больш за 3 тысячы выкладчыкаў.

**Музей.** Традыцыйнае свята «Крочым у школу разам з Коласам», прымеркаванае да Дня ведаў, праходзіць сёння ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. У праграме — экскурсія па мемарыяльнай частцы музея і прагляд тэатралізаванага прадстаўлення па беларускіх народных казках у апрацоўцы Якуба Коласа, музейна-педагагічныя заняткі, куратарская экскурсія па часовай экспазіцыі «Кола(с) часу», квэст «Таямніцы дома Песняра».

• Музей В. Г. Мулявіна ў Белдзяржфілармоніі папоўніцца новымі экспанатамі, звязанымі з дзейнасцю легендарных «Песняроў». Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» перадае ў фонды музея гуказапіснае абсталяванне і музычныя інструменты, якія выкарыстоўваліся калектывам пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мулявіна. У 1990-я гады ў ансамблі дзейнічала творчая лабараторыя, дзе музыканты не толькі рэпеціравалі, але і запісвалі кампазіцыі. Ва ўстанове адзначаюць, што Уладзімір Мулявін надаваў вялікую ўвагу як складанню рэпертуару, так і якасці запісу выкананых песень. У «Песняроў» было найлепшае на той час гуказапісное абсталяванне сусветных брэндаў.

**Праект.** Мемарыяльны праект «Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка», прымеркаваны да 120-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, працуе ў Заслаўі. Экспазіцыю можна ўбачыць у музейна-выставачным комплексе гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе». Яна з'яўляецца вынікам сумеснай работы запаведніка і Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Музея гісторыі Беларускай чыгункі, Цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі БЧ і Мінскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея. Як піша БелТА, праект быў створаны для таго, каб звярнуць увагу людзей на вядомага прадстаўніка літаратуры, які з'яўляецца ўраджэнцам Заслаўя, і паказаць гісторыю чыгункі, што адыграла вялікую ролю ў станаўленні краіны.

**Тэатр.** Чытка сцэнарыя фільма «Белыя росы» з удзелам акцёраў Новага драматычнага тэатра і студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў прайшла ў Мінску. Мерапрыемства адбылося ў кінапрасторы *тоооп* у рамках праекта «Кінасцэна». Рэжысёрам чыткі выступіла рэжысёр Новага драматычнага тэатра Лізавета Машковіч. На яе думку, фармат чыткі дазволіў раскрыць новыя магчымасці вядомага тэксту драматурга і сцэнарыста Аляксея Дударава. Праект прысвечаны яго памяці.

**Рэгіён.** Пяты абласны адкрыты жывапісны пленэр «Фарбы маёй зямлі» прайшоў у Тураўскім раёне, паведамляе БелТА. Сярод удзельнікаў — члены Саюзаў мастакоў Беларусі і Расіі, выкладчыкі Гомельскага мастацкага каледжа, майстры пленэрнага жывапісу Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, настаўнікі дзіцячых школ мастацтваў вобласці. У праекце прыняў удзел малады мастак з Цэнтра інклюзіўнай культуры Гомеля Аляксандр Пакацілa. Завяршыўся пленэр адкрыццём выстаўкі «Фарбы маёй зямлі» ў Тураўскім Доме культуры.

Ігар БУЗОЎСКІ:

# «Пра ўвагу да пісьменніцкага слова сведчаць 30 гадоў падтрымкі»

**Горад Гарадок Віцебскай вобласці гатовы сустракаць вялікае свята. Галоўная сцэна, дзе пройдуць урачыстыя мерапрыемствы, тэматычныя пляцоўкі, што збяруць найбольш зацікаўленых, кніжны кірмаш, які, несумненна, парадуе аматара чытання, — толькі невялікая частка чарговага Дня беларускага пісьменства.**


Фота БелТА.

— Акцэнт XXX Дня беларускага пісьменства — на юбілейныя даты, — расказвае намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Бузоўскі. — 30 гадоў — тэрмін, які дазваляе рэзюмаваць зробленае. Гэта быў час сур'ёзнай работы прафесіяналаў самых розных галін — пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў, кнігараспаўсюджвальнікаў. І тут немагчыма не зрабіць выснову, што ў нас, у Рэспубліцы Беларусь, увага да кнігі надзвычайная. Яе ўдзяляе і Кіраўнік дзяржавы. Прававыя, нарматыўныя дакументы ў гэтай сферы, якія вызначаюць у тым ліку і святкаванне Дня беларускага пісьменства, сведчаць пра вялікую зацікаўленасць, неабыякавасць да развіцця галіны з боку ўлады. Пра ўвагу да пісьменніцкага слова сведчаць 30 гадоў падтрымкі, ацэнкай на самых розных узроўнях, на міжнароднай арэне. Так, удзельнікі Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу — а гэта дыпламаты, пісьменнікі, выдаўцы — падкрэсліваюць унікальнасць стаўлення да кнігі ў нашай краіне. Гэта не пафас, а рэальныя ацэнкі.

***Пачатак Фестывалю кнігі і прэсы дасць праект «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» калекцыянера, гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава. Аўтар супрацоўнічае з рознымі дзяржаўнымі структурамі, арганізацыямі і пры падтрымцы Мініфарма рэалізоўвае свае задумы. Апроч іншых цікавостак, якія суправаджаюць «Бацькаўшчыну», ахвотным будуць прапаноўваць стужкі з беларускім арнаментам. Мяркуецца, што «Стужка часу Бацькаўшчыны» стане сімвалам праекта.***

Яшчэ адна ключавая дата, якой будзе ўдзяляцца ўвага падчас правядзення разнастайных тэматычных мерапрыемстваў, — 80-годдзе вызвалення Гарадка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тэма акупацыі і вызвалення Гарадоччыны, Перамогі будзе адлюстравана, напрыклад, у канцэртных нумарах урачыстых адкрыцця і закрыцця Дня беларускага пісьменства, у праграмах розных пляцовак, у тым ліку цэнтральнай. Па ацэнках намесніка міністра інфармацыі, будзе прэзентавана вялікая колькасць праектаў, падтрыманых і рэалізаваных айчыннымі выдавецтвамі.

— Віцебская зямля славутая выдатнымі дзеячамі культуры, мастацтва і літаратуры, — нагадвае Ігар Бузоўскі. — Менавіта ўраджэнцы гэтых мясцін далі імпульс да развіцця беларускага кнігадрукавання. Гэтыя асобы, іх дзейнасць таксама знойдуць адлюстраванне ў розных праектах. Не забудуцца пра іх і падчас цырымоній адкрыцця і закрыцця свята. Між тым асобная тэма — 140-годдзе Янкі Маўра. Святкаванне яго юбілею само сабой разумеецца. Між тым гэта не проста чарговае згадванне класіка — адбудзецца прэзентацыя тома выбраных твораў «Мастацкай літаратуры».

Крышачку апярэдзіла Дзень беларускага пісьменства асобная ініцыятыва — рэспубліканскі конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка», цёпла сустрэты і падтрыманы дзятвой і моладдзю — аматарамі чытання і дэкламацыі вершаў. Ігар Бузоўскі звяртае ўвагу на руплівую падрыхтоўку ўдзельнікаў — ад выбару твора да прэзентацыі праекта на телебачанні. Між тым асобнай гаворкі заслугоўвае тэматыка, да якой звяртаюцца аматары паэзіі. Перамога, Вялікая Айчынная вайна, любоў да роднай зямлі і слова — ключавыя матывы твораў, якія зацікавілі канкурсантаў. Падвядзенне вынікаў творчага спаборніцтва ўжо адбылося — яркія нумары фіналістаў можна будзе ацаніць у тым ліку падчас урачыстага адкрыцця свята ў Гарадку.

— Не магу пакінуць па-за ўвагай наш Фестываль кнігі і прэсы, да арганізацыі якога прычыніўся вялізны калектыў, — адзначае намеснік міністра. — Увазе наведвальнікаў будзе прапанаваны зрэз актуальнай рэспубліканскай прэсы, а таксама кнігі сучасных празаікаў, паэтаў, драматургаў, публіцыстаў кожнай з абласцей краіны — рэгіянальныя аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі прадставяць свае напрацоўкі. Хочацца, каб выданні, якія пабачылі свет цягам апошніх гадоў, не проста зацікавілі, а паслужылі асновай для сувязі пісьменнікаў з наведвальнікамі. Чытачы змогуць атрымаць адказы наконт таго, якая работа вядзецца ў рэгіёнах. Спадзяюся, падрыхтаваныя абласнымі аддзяленнямі праекты парадуюць усіх, хто з імі пазнаёміцца.

Дарэчы, пачатак Фестывалю кнігі і прэсы дасць праект «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» калекцыянера, гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава. Аўтар супрацоўнічае з рознымі дзяржаўнымі структурамі, арганізацыямі і пры падтрымцы Мініфарма рэалізоўвае свае задумы. Апроч іншых цікавостак, якія суправаджаюць «Бацькаўшчыну», ахвотным будуць прапаноўваць стужкі з беларускім арнаментам. Мяркуецца, што «Стужка часу Бацькаўшчыны» стане сімвалам праекта.

Што тычыцца асновы праграмы, то напярэдадні традыцыйна ладзіцца рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з Жыватворным агнём ад Гроба Гасподняга. Яе ўдзельнікамі за 30 гадоў стала 415 чалавек. 30 жніўня экспедыцы быў дадзены старт. Сёння ж праходзіць круглы стол «Роля кнігі ў жыцці грамадства: мінулае і сучаснасць».

***Крышачку апярэдзіла Дзень беларускага пісьменства асобная ініцыятыва — рэспубліканскі конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка», цёпла сустрэты і падтрыманы дзятвой і моладдзю — аматарамі чытання і дэкламацыі вершаў. Ігар Бузоўскі звяртае ўвагу на руплівую падрыхтоўку ўдзельнікаў — ад выбару твора да прэзентацыі праекта на телебачанні. Між тым асобнай гаворкі заслугоўвае тэматыка, да якой звяртаюцца аматары паэзіі. Перамога, Вялікая Айчынная вайна, любоў да роднай зямлі і слова — ключавыя матывы твораў, якія зацікавілі канкурсантаў.***

— Асаблівасць сёлетняй сустрэчы заключаецца ў тым, што адначасова з Днём беларускага пісьменства праходзіць Маскоўскі міжнародны кніжны кірмаш, дзе Беларусь выступае ганаровым госцем. Наш стэнд там — цэнтральны, у рамках яго работы мы і праводзім круглы стол. Такім чынам аб'ядноўваем, кансалідуем пляцоўкі Беларусі і Расіі. Хочацца, каб самыя розныя людзі, а не толькі пісьменнікі і выдаўцы, паразважалі пра тое, што кніга значыла раней і што такое кніга сёння. Ці змяніла сваю ролю? Што выдаецца апошнім часам? Наколькі новыя творы актуальныя? Наколькі неабходныя і важныя для асобнага чытача і для цэлай краіны?

2 верасня адбудуцца «Гарадоцкія чытанні» (навукова-практычная канферэнцыя).

— Гэта знакавая падзея. Хоць часта мы крытыкуем традыцыйную канферэнцыю — з-за невялікай аўдыторыі. Хацелася б, каб навуковыя чытанні набылі больш шырокі розгалас. Магчыма, гэта справа будучыні, — разважае Ігар Бузоўскі. — Цікавыя падзеі і факты, невядомыя ці малавядомыя шырокаму колу чытачоў, — прадмет навуковых даследаванняў. Спрыянне Акадэміі навук дапамагае мясцовым пісьменнікам, краязнаўцам, музейшчыкам, бібліятэкарам выкарыстоўваць новыя звесткі ў адмысловых праектах.

Ключавой падзеяй свята Ігар Бузоўскі называе ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Так, намеснік міністра інфармацыі падзяліўся наступным фактам: адзін з пераможцаў праекта *LitUp* стаў фіналістам галоўнай прэміі па літаратуры ў Беларусі. Што да астатніх цікавостак… Завітайце на Дзень беларускага пісьменства ў Гарадок!

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Пераможцы Нацыянальнай літаратурнай прэміі

**«Найлепшы твор (зборнік твораў) паэзіі»** — Соф'я Шах за кнігу «Дыядэмная споведзь».

**«Найлепшы твор прозы»** — Уладзімір Гаўрыловіч за кнігу «Па веры вашай…».

**«Найлепшы твор публіцыстыкі»** — Уладзімір Макараў за кнігу «Во имя будущего страны. О приоритетах национальной безопасности в новом веке».

**«Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства»** — Аліна Сабуць за кнігу «Літаратурныя дыялогі: мастацкія пошукі беларускай літаратуры ХХ—ХХІ стагоддзяў».

**«Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва»** — Алена Стэльмах за кнігу «Пашка і сонечны праменьчык».

**«Найлепшы дэбют»** — Алеся Прыходзька за кнігу «Хлюпик и друг его Нюня».

## Рэспубліканскі паэтычны конкурс імя Міколы Мятліцкага сярод маладых паэтаў

1. Чарговы конкурс праводзіцца Саюзам пісьменнікаў Беларусі, прысвячаецца вядомаму паэту і перакладчыку, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы, лаўрэату спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, заслужанаму дзеячу культуры Беларусі Мікалаю Міхайлавічу Мятліцкаму, з'яўляецца штогоднім і прымеркаваны да Рэспубліканскага фестывалю нацыянальнай песні і паэзіі.

2. Мэта конкурсу: выяўленне і падтрымка новых маладых талентаў.

3. У конкурсе могуць прымаць удзел маладыя паэты ва ўзросце да 30 гадоў, якія дасылаюць тры свае вершы на беларускай мове.

4. Тэматыка розная: Радзіма, родны край, мір, сяброўства, стваральная праца, маці, прырода, супрацоўніцтва, каханне.

5. Творы дасылаюцца на адрас: г. Мінск, вул Фрунзэ, д. 5, 220034, Саюз пісьменнікаў Беларусі (каб. 308) або на электронны адрас: *mgo-oo-spb@mail.ru* (з пазнакай — на конкурс імя Міколы Мятліцкага).

6. Канкурсанты ўказваюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, дату нараджэння, адрас, тэлефоны для сувязі.

7. Творы прымаюцца да 1 мая 2024 г.

8. Урачыстае падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца ў чэрвені на Рэспубліканскім фестывалі нацыянальнай песні і паэзіі ў г. Маладзечне, дзе лаўрэаты атрымаюць права выступіць са сваімі вершамі.

**Міхась ПАЗНЯКОЎ, старшыня журы конкурсу**

## Узнаўленне працэсаў

**У Доме літаратара прайшла сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Таджыкістан у Рэспубліцы Беларусь Бахтаварам Аміралі Сафарзадою.**

Падчас перагавораў, удзел у якіх прынялі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч і намеснік старшыні СПБ Аляксей Чарота, ішла размова пра актывізацыю супрацоўніцтва паміж беларускай і таджыкскай пісьменніцкімі супольнасцямі.

— Ведаю, што паміж Саюзамі пісьменнікаў Таджыкістана і Беларусі існуе Пагадненне аб супрацоўніцтве, — зазначыў дыпламат. — Магчыма, наспела патрэба штосьці адкарэкціраваць, канкрэтызаваць. Спадзяюся, што можна зрабіць гэта ў самы бліжэйшы час. Прыблізна дзесяць гадоў назад выйшаў цэлы шэраг кніг: беларускіх аўтараў у Таджыкістане, таджыкскіх — у Беларусі. Мяркую, што варта ўзнавіць гэтыя працэсы. Тым больш што старшыня СП Беларусі з'яўляецца і членам Саюза пісьменнікаў Таджыкістана, а яшчэ і старшынёю таварыства дружбы «Беларусь — Таджыкістан». А народны пісьменнік Таджыкістана Ато Хамдам — член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

А. Карлюкевіч распавёў пра тое, што беларускім бокам па папярэдняй дамоўленасці з таджыкскімі калегамі ўкладзена анталогія сучаснай беларускай літаратуры для перакладу і выдання ў Душанбэ. Кіраўнік таджыкскай дыпламатычнай місіі зазначыў, што пасольства ўжо рыхтуецца да традыцыйнага Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу, які чарговы раз пройдзе ў сакавіку 2024 года. Бахтавар Аміралі Сафарзада звярнуўся да кіраўніцтва СПБ з просьбай паспрыяць выданню кнігі новых перакладаў твораў двух класікаў усходняй паэзіі — Амара Хаяма і Рудакі на беларускую мову.

**Сяргей ШЫЧКО**

**Міхась ПАЗНЯКОЎ**

**Гарадку**

*Дзень добры, слынны Гарадок —*
*Мясціна дзіўна светлая!*
*Спяліў Грыгор'еў тут радок*
*І піша кнігі тут Саветная!*
*Ты і Скарынкіна люляў,*
*Сыноў, дачок сваіх вядомых,*
*Хто шчодра славу памнажаў*
*Тваю настойліва, без стомы.*
*Тут Вераніцын Канстанцін*
*Стварыў «Тараса на Парнасе» —*
*Паэму, што з сівых часін*
*Выдатная і ў нашым часе.*
*Тут адшумела шмат падзей,*
*Край горды, мужны, старажытны,*
*Край рупных, залатых людзей*
*Малочны, бульбяны і жытны!*
*Змагаўся, верыў, будаваў*
*Рашуча ты з вякоў былінных,*
*Аўтарытэт свой узвышаў*
*Дзеля народа і краіны.*
*Дзень яркі, шчасны бачу твой,*
*Мне, госцю, тут не надзівіцца*
*Тваёю славай і красой,*
*Пісьменства нашага сталіца!*
*Тваё багацце — твой народ*
*І продкаў велічная праца!*
*Шчыруй, квітней сто тысяч год!*
*І хай табою ганарацца!*

**Алена СТЭЛЬМАХ**

**Гарадок**

Гасцей ад краю і да краю
Горад слынны сустракае.
Кожны слова тут знаток —
Прывітанне, Гарадок!!!

*Прыпеў:*
Гарадок, наш Гарадок!
Тут пісьменнасці вытук.
Грай, музыка, гучна грай!
Праслаўляй радзімы край!

Кружыць свята карагод,
Сябры танчаць у ім штогод.
І ляціць паэта слова —
Як жар-птушка — адмыслова.

*Прыпеў.*

Нам бы праз чарговы год
Зноўку зладзіць карагод!
Беларускае суквецце —
Бачце людзі ў цэлым свеце!

*Прыпеў:*
Гарадок, наш Гарадок!
Тут пісьменнасці вытук.
Грай, музыка, гучна грай!
Праслаўляй радзімы край!

# Справаздачы, планы, перспектывы…

**На пасяджэнні прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі, якое прайшло 24 жніўня, абмеркавана шэраг актуальных пытанняў развіцця творчай арганізацыі.**

З дакладам аб удзеле пісьменнікаў краіны ў ХХХ Дні беларускага пісьменства ў Гарадку выступіла першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах. У святочныя дні (2—3 верасня) пісьменнікі з розных абласцей краіны прадставяць на асобных пляцоўках у Гарадку кніжныя здабыткі за мінулыя гады. Будзе таксама арганізаваны і агульны музычна-паэтычны канцэрт на галоўнай сцэне свята.

Жывыя дыскусіі выклікаў разгляд пытання аб справаздачы па рабоце літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя». Дакладчыкам выступіў галоўны рэдактар выдання паэт і празаік Віктар Шніп. Выказана пажаданне зрабіць гэты кірунак у рабоце прэзідыума болей сістэмным. А па выніках выкладаць канкрэтныя прапановы арганізацыйна-творчага характару. Са справаздачай аб рабоце секцыі краязнаўства выступіў старшыня СПБ і адначасова старшыня секцыі Алесь Карлюкевіч. Ён распавёў пра тое, якія кнігі краязнаўчай краіны, тых пісьменнікаў, якія займаюцца гістарычнай публіцыстыкай, у найбліжэйшы час пабачаць свет. Размова ішла пра зборнікі нарысаў Святланы Кошур, Мікалая Барысенкі, іншыя выданні.

Пра супрацоўніцтва творчай арганізацыі з іншымі зацікаўленымі ўстановамі і асобамі ў частцы тэатральнай дзейнасці расказаў дырэктар Цэнтра падтрымкі літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі Анатоль Матвіенка.

**Сяргей ШЫЧКО**

# Прыняты ў СПБ



**Ірына Асгатаўна БУРАК.** Нарадзілася 14 студзеня 1959 года ў г. Патсдам (Германія). Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала карэспандэнтам у газетах «Ленінец», «Навіны Акадэміі навук Беларусі», «Белорусская военная газета. Во славу Родіны». Аўтар кніг публіцыстыкі «Спешите делать добро», «Офицерские жены».



**Яўгеній Георгіевіч ГОЛУБЕЎ.** Нарадзіўся 14 ліпеня 1950 года ў Рызе (Латвія). Скончыў Даўгаўпілскі педагагічны інстытут, Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна (Масква). Служыў у Беларусі, Германіі, Латвіі. З 1991 года жыве ў Даўгаўпілсе (Латвія). Аўтар зборнікаў вершаў «Солнце в стогах», «Пульс памяти», «Осенние створы», «Следов пленительная грусть» і інш.



**Алена Ігараўна ЛЮБЧАНКА (Алена Курэк).** Нарадзілася 27 ліпеня 1982 года ў Магілёве. Скончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова. Працуе педагогам-арганізатарам у СШ №18 г. Магілёва, кіраўнік тэатральнай студыі «Натхненне». Друкавалася ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, літаратурным альманаху «Прыдняпроўе — Магілёўшчына літаратурная». Аўтар кнігі для дзяцей «Мальчишкины рассказы».



**Людміла Міхайлаўна МУХА (Людміла Маркоўская).** Нарадзілася 16 лютага 1956 года ў п. Альхоўка Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала настаўніцай, намеснікам дырэктара Мінскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа № 2 імя Максіма Танка, у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Аўтар кніг прозы «Забыть невозможно вернуться», «Миллефиори».

# Родам з васількавай краіны

**27 жніўня перастала біцца сэрца выбітнага паэта-песенніка Івана Васільевіча Цітаўца. Нарадзіўся 1 красавіка 1935 года ў вёсцы Вялікі Вязок Крупскага раёна Мінскай вобласці ў шматдзетнай сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў пасля заканчэння сямігодкі. Закончыў Маскоўскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум і Беларускі тэхналагічны інстытут. Па адукацыі — інжынер-механік. Працаваў на будоўлях, заводах і амаль 30 гадоў — педагогам. Ганаровы грамадзянін Крупскага раёна.**



Аўтар каля 500 песень, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат літаратурнай прэміі «Залаты купідон» I ступені. Аўтар кніг: «Дзіўная старана», «Сполохи» (абедзве выйшлі ў 1996 г. ), «Квітней, Беларусь!» (2005), «Далёкая вясна» (2010), «Вішня белая» (песні і вершы, 2010), «Неразгаданы круг» (песні, 2011), «Васільковая краіна» (песні для дзяцей, 2013).

Песні на яго вершы выконвалі Якаў Навуменка, Уладзімір Правалінскі, Уладзімір Яскевіч, Ірына Дарафеева, Леанід Нікольскі, Іван Краснадубскі, Святлана Суседчык, Валянціна Карэлікава, Валянцін Кірыленка, Валянціна Альшанская народны хор імя Г. Цітовіча, ансамблі «Свята», «Бяседа», «Церніца», «Вербніца», «Крупчанка» і іншыя.

Іван Васільевіч вельмі ганарыўся, што яго песні спяваюць Іосіф Кабзон і Мікалай Гнацюк. З Ігарам Лучанком яны напісалі больш за 30 песень.

Створанае ім будзе яшчэ многія гады радаваць шматлікіх чытачоў і слухачоў.

**Саюз пісьменнікаў Беларусі**

# «Роднае слова трымае экзамен перад вечнасцю…»

**Напярэдадні свята прыгожага пісьменства ў Гарадку наш карэспандэнт задаў шэраг пытанняў старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесю Карлюкевічу.**



**— Алесь Мікалаевіч, пра якія навацыі можна гаварыць у дачыненні да сёлетняга Дня беларускага пісьменства?..**

— Навацыі — слова сучаснае. Але і яны, зразумела, павінны быць заснаваны на традыцыях. Дзень беларускага пісьменства — сапраўды дзяржаўнае, усенароднае свята ў нашай краіне. Вопыт яго правядзення на працягу многіх дзесяцігоддзяў — гэта сведчанне тых шырокіх намаганняў самых розных інстытутаў улады, шырокай грамадскасці ў справе ўшанавання беларускага слова. І, канешне ж, штогод у розных гарадах краіны ўсталёўваюцца новыя помнікі, памятныя знакі, прыводзяцца ў належны стан бібліятэчныя і адукацыйныя ўстановы, ды і ўвогуле розная інфраструктура вялікіх і малых гарадоў краіны, тых раённых цэнтраў, дзе праводзіцца свята.

А калі весці размову пра сёлетнія навацыі, то відавочна: пабольшала ўвагі да пісьменніцкай супольнасці. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, аргкамітэт свята спланавалі работу літаратараў такім чынам, што кожная рэгіянальная арганізацыя нашага творчага саюза будзе прадстаўлена на асобнай пляцоўцы. Пісьменнікі ў межах гэтых пляцовак пазнаёмяць гасцей свята са сваімі кнігамі, прагучаць вершы, песні, будзе ісці размова пра творчыя здабыткі. А поруч абласныя бібліятэкі краіны разгорнуць тэматычныя выстаўкі, пакажуць кнігі, якія ў апошнія гады выйшлі на тэму таго ці іншага куточка нашай Радзімы, кнігі, якія напісалі ўраджэнцы той ці іншай старонкі.

І, вядома ж, і на астатніх пляцоўках будзе гаспадарыць кніга, загучаць мастацкія словы. Афіцыйная дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі будзе складаць болей як 100 паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, драматургаў, перакладчыкаў. Сваімі творчымі знаходкамі, адкрыццямі падзеляцца яны і на цэнтральнай пляцоўцы свята. Будзе і шмат прэм'ер — у тым ліку і песенных. Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Алена Стэльмах наўмысна да свята і песню пра Гарадок напісала. Дарэчы, добры прыклад! Чаму б да кожнага свята з пэўным адрасам не ствараць новую песню?! І з часам будзе сапраўдная анталогія такіх музычных і паэтычных твораў. Магчыма, да наступнага Дня беларускага пісьменства мы і конкурс адпаведны абвесцім.

**— Часам Дзень беларускага пісьменства называюць літаратурнымі дажынкамі… Ці правільным было б гаварыць пра падсумоўванне творчых здзяйсненняў у пярэдадзень Дня пісьменства?**

— Чаму б і не?!. Дарэчы, на Гомельшчыне, дзякуючы руплівасці, напружанай працы старшыні Гомельскага абласнога аддзялення празаіка, публіцыста, проста таленавітага чалавека і вопытнага, выключна ініцыятыўнаага арганізатара літаратурнага працэсу Уладзіміра Гаўрыловіча, якраз і праходзяць «Літаратурныя Дажынкі». Вопыт сваіх калег тым ці іншым чынам бяруць на ўзбраенне і пісьменнікі з іншых рэгіёнаў краіны. Прабачце, што адыходжу ад прамога адказу, але не магу не падкрэсліць, што ва ўсіх аддзяленнях праводзіцца шмат розных святочных рэгіянальных імпрэз — і на Гродзеншчыне, і на Берасцейшчыне, і на Віцебскай зямлі, і на Магілёўшчыне, і на Міншчыне, ды і, зразумела, у самім Мінску. Падсумоўванне творчых здабыткаў, разгляд кніг, выпушчаных на працягу года, размовы, ацэнка зробленага — добрая нагода і планы вызначыць, а не толькі ацэнкі здзейсненаму даваць…

**— І калі пра канкрэтыку, то што ў агульны кніжны каравай, у дадатак да зробленага раней, прыўносіце менавіта цяпер?**

— Вельмі шмат кніг выдадзена літаральна за апошніх паўгода-год у галіне дзіцячай літаратуры. Гэта звязана і з увагай дзяржаўных выдавецтваў, найперш сістэмы Міністэрства інфармацыі, да дзіцячага кнігавыдання, і з плённай работай секцыі дзіцячай літаратуры, якую ў СПБ узначальвае Алена Стэльмах, і з падтрымкай, якую мы адчуваем з боку бібліятэк Міністэрства культуры, з боку агульнаадукацыйных школ краіны. Назаву хаця б такіх аўтараў, як Генадзь Аўласенка, які знайшоў сябе ў жанры пазнавальных тапанімічных казак, Алену Стэльмах, якая добра адчувае дзіцячую аўдыторыю, прыдумвае даволі прыкметных герояў, Кацярыну Хадасевіч-Лісавую, Вухуцік якой захапіў ужо тысячы юных чытачоў… Дарэчы, па ініцыятыве ганаровага старшыні СПБ, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца мы звярнуліся да бібліятэк і Мінкульта, і Міністэрства адукацыі з просьбай прасачыць па 50 ці нават болей пісьменнікаў краіны кнігавыдачы. Цікавая атрымалася статыстыка!.. Мы бачым, што з кнігамі сучасных літаратараў працуюць, што яны запатрабаваны чытачамі розных катэгорый. У найбліжэйшы час па выніках гэтай працы, за якую вельмі і вельмі ўдзячны двум міністэрствам — культуры і адукацыі, правядзём дэталёвы аналіз, агучым, як нам падаецца, цікавыя лічбы. І, канешне ж, зробім высновы.

А калі прадаўжаць тэму здабыткаў у дачыненні да дзіцячай літаратуры, то не магу не назваць Жанну Міус, Уладзіміра Мазго, Міхася Пазнякова, які актыўна працуе ў самых розных жанрах мастацкай літаратуры. Дарэчы, Міхась Паўлавіч — і актыўны, дбайны перакладчык. Хацелася б, каб чытач звярнуў увагу на перакладзеныя ім раманы Мухтара Аўэзава, прысвечаныя класіку казахскага прыгожага пісьменства Абаю. Гэта сапраўды падзея ў развіцці беларуска-казахскіх літаратурных, гуманітарных сувязей!..

Што да мастацкай прозы, то, на мой погляд, знайшоў свайго чытача раман Уладзіміра Гаўрыловіча «Па веры ваша». Летась выйшла яго першая кніга. Часопіс «Полымя» надрукаваў працяг. Мне здаецца, што пісьменнік прадоўжыць сваю работу над гэтым творам, над гэтай тэмай. Адметна, што ў рамане даволі шмат разваг пра сучаснасць, выразная спроба адлюстраваць найноўшыя падзеі беларускай рэчаіснасці.

Па-ранейшаму плённа працуюць у паэзіі Анатоль Аўруцін, Алесь Казека, Алесь Бадак, Віктар Шніп, Валянціна Палікаціна, Міхась Башлакоў, Андрэй Цяўлоўскі, Рагнед Малахоўскі, Тамара Краснова-Гусачэнка, Андрэй Скарынкін, Ірына Аўсеп'ян, Алена Басікірская, Расціслаў Бензярук, Мікола Антаноўскі, Таццяна Яцук, Дзмітрый Радзівончык, Таццяна Лейка, Таццяна Дашкевіч, Елізавета Палеес, Зміцрок Марозаў, Людміла Кебіч, якая і празаічную кнігу нядаўна выдала… Сучасная беларуская літаратура багатая і на імёны празаікаў — Уладзімір Саламаха, Віктар Праўдзін, Алесь Марціновіч, Анатоль Бензярук, Аляксандр Валковіч, Таццяна Дземідовіч, Уладзімір Мажылоўскі, Анатоль Матвіенка, Анатоль Драздоў, Леанід Крыванос, Ягор Конеў, Сяргей Клімковіч, Аляксандр Сакалоў… Апошнім часам нельга было не заўважыць адразу некалькі кніг Ганны Чыж-Літаш. Яна смела асвойвае раман і аповесць, пішa з разлікам на дарослага чытача і падлетка. Раман Ганны Чыж-Літаш «Дары Бога», выдадзены немалым для сённяшняга часу тыражом, хутка знік з паліц кнігарняў, разышоўся з выдавецтва. Мне здаецца, што будуць яго перавыданні.

**— Чытач заўважыў, а крытыка?..**

— Так, я асабіста памятаю дзве ці нават больш рэцэнзій… Хацелася б, каб пра кнігу загаварылі ў школе. Паверце, яна таго вартая. Для падлеткаў і пра падлеткаў не так шмат у нас і пішуць. У Выдавецкім доме «Звязда» ёсць серыя «Пераходны ўзрост». Шукаем рукапісы пад гэты творчы праект!.. Мяркую, што і іншыя выдавецтвы адгукнуліся б на ініцыятывы ў гэтых тэматычных абсягах.

А што да крытыкі, то ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі яе ўзначаліў Валерый Максімовіч, чалавек і даследчык неабыякавы. Веру, што разам з калегамі ён шмат чаго прыўнясе ў агляданне сучаснага літаратурнага працэсу — і ў газеце «Літаратура і мастацтва», і ў часопісах «Полымя», «Маладосць». Дарэчы, добра было б адрадзіць гадавік крытыкі і літаратуразнаўства «Вобраз». Ён некалі прыцягваў увагу і самiх пісьменнікаў, і тых, хто вывучае мастацкую літаратуру. На старонках такога гадавіка, такога альманаха можна было б ставіць сур'ёзныя дыскусійныя пытанні, разважаць пра тое, куды, у які бок рухаецца літаратура альбо той ці іншы яе від. Іншая справа, што ў дадатак да ініцыятыўнасці Валерыя Максімовіча патрэбна падтрымка ўніверсітэцкага і акадэмічнага літаратуразнаўства. Дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Іван Саверчанка — сапраўдная наша ў гэтым апора. Ды і на ўніверсітэцкіх выкладчыкаў, якія ўваходзяць у наш Саюз, вельмі спадзяёмся — Вольгу Русілку, Аліну Сабуць, Алеся Бараноўскага і іншых даследчыкаў.

На свяце ў Гарадку не абмінуць увагай і арганізатары, і ўдзельнікі кнігі цэлага шэрага публіцыстаў — філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава, чый альбом «Ад Віцебска да Полацка» можна будзе набыць у Гарадку, майстроў палітычнай публіцыстыкі Андрэя Мукавозчыка, Сяргея Мусіенкі, Людмілы Гладкай, Андрэя Тура, Рыгора Азаронка… Пра іх ужо неадноўчы гаварылася. Дарэчы, Андрэй Мукавозчык — старшыня секцыі публіцыстыкі Саюза пісьменнікаў… Мы ў СП Беларусі стварылі грамадска-палітычны кансультатыўны савет, які ўзначаліў Мікалай Іванавіч Чаргінец. Якраз на яго пляцоўцы і праводзяцца, і плануюцца розныя экспертныя размовы… Спадзяёмся, што яны падштурхнуць і да нараджэння многіх цікавых кніг.




Асобна я хацеў бы сказаць пра інтэлектуальныя, багатыя на разважанні кнігі вучонага і публіцыста, дзяржаўнага дзеяча Аляксандра Міхайлавіча Радзькова. Ён так лагічна ўвайшоў у пісьменніцкую грамаду, што, здаецца, заўсёды быў працоўнай, знакавай часцінкай нашага творчага калектыву. А кнігі Аляксандра Радзькова пра рэктараў, матэматыкаў і фізікаў — неад'емная частка таго складніка сённяшняга літпрацэсу, які проста нельга абмінуць. Чытанне ўжо пенталогіі ці пяцікніжжа Аляксандра Радзькова — гэта інтэлектуальная праца. Мне здаецца, што наспеў у Саюзе час стварыць пастаянна дзеючы семінар навуковай публіцыстыкі. Якім ён будзе — вырашаць нам усім разам.

Хацелася б звярнуць увагу і на такі кірунак творчай працы, як краязнаўства. Вельмі актыўна, напружана ў гэтай сферы працуюць дзясяткі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. А гэта — Ігар Пракаповіч, Анатоль Бензярук, Таццяна Канапацкая, Святлана Кошур… Вось толькі што, літаральна да Дня беларускага пісьменства ў Гарадку, Святлана Андрэеўна Кошур выдала даволі грунтоўны і цікавы зборнік нарысаў пра людзей і мясціны навагрудскага, карэліцкага краю. Мне здаецца, што кніга будзе запатрабаванай у чытача не толькі ў Карэлічах і Навагрудку, але і ва ўсёй краіне.

**— Што пажадалі б, Алесь Мікалаевіч, калегам-пісьменнікам у пярэдадзень свята прыгожага пісьменства?**

— Новых творчых здзяйсненняў! Уважлівага, разумнага чытача!

**Гутарыў Ігнат ПАЎЛАЎ**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**

# На Парнасе богі, як людзі



**Канешне, галоўнага героя паэмы «Тарас на Парнасе» ведаюць многія і многія. Ды і змест гэтай, без перабольшання, народнай паэмы шмат у каго на слыху. Таму так добра ведаюць яе нашы сучаснікі. Незалежна ад узросту. Пачынаючы ад вучняў, якія знаёмяцца з «Тарасам на Парнасе» у школе, да іх бацькоў, што некалі далучыліся да яе таксама на ўроках літаратуры. Далей жа атрымліваецца своеасаблівая эстафета, што вядзе ад пакалення да пакалення.**

**Цудоўна былі знаёмы з Тарасам і яго прыгодамі на Парнасе не толькі нашы дзяды, але і прадзеды. Пачынаючы з 1899 года, калі гэты найцудоўнейшы твор упершыню быў апублікаваны ў газеце «Минский листок» (нумар 37 за 16 мая). Пасля многія з задавальненнем распаўсюджвалі тэкст у рукапісах. Не толькі для сябе, а і для іншых. Пазней з'явіліся шматлікія перадрукі. Адна бяда — нявысветленым заставалася пытанне, хто ж аўтар «Тараса на Парнасе». А так хацелася ведаць. Шматлікія пошукі нарэшце прынеслі плён. Дзякуючы «каралю факта»» Генадзю Кісялёву было канчаткова ўстаноўлена, што напісаў гэтую паэму Канстанцін Вераніцын.**

## Загадак шмат, адгадкі няма

Высвятленне ж аўтарства «Тараса на Парнасе» працягвалася доўга. Не гады заняло, а дзесяцігоддзі. Да свайго роду адысеі пошукаў спрычыніліся многія даследчыкі. Адным з іх і стаў Генадзь Васільевіч. Да яго ж называліся шмат якія імёны тых, хто мог паэму напісаць. І знакамітыя аўтары, і менш вядомыя. Але як хутка з'яўляліся кандыдаты, так неўзабаве і адпрэчваліся.

Напрыклад, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Чаму б яму было не напісаць «Тараса на Парнасе». Чалавек начытаны, у літаратуры цудоўна разбіраецца. Паспеў напісаць і шмат яркіх твораў. Добра ведаў творчасць тых пісьменнікаў, з якімі на Парнасе сутыкнуўся Тарас. Аднак тыя, хто не сумняваўся ў яго аўтарстве, не прымалі пад увагу таго, што яго манера пісьма не адпавядае той, якая назіраецца ў «Тарасе на Парнасе».



*Фота з сайта nlb.by*

Тое самае тычылася і Арцёма Вярыгі-Дарэўскага — паэта, драматурга, публіцыста. А яшчэ і даследчыка фальклору. Апошнее і ўвяло ў зман тых, хто бачыў у ім патэнцыяльнага аўтара. Сапраўды, фальклорная плынь у паэме відавочная, але не такая, якая была харатэрна Арцёму Вярыгу-Дарэўскаму.

Пры ўважлівым знаёмстве з тэкстам «Тараса на Парнасе» высветлілася, што нельга назваць аўтарам і Францішка Багушэвіча. Як і Вікенція Равенскага — паэта, драматурга, аўтара незавершанай беларускай версіі «Энеіды» Івана Катляроўскага пад назвай «Энеіда навыварат». Яна хоць і цытуецца ў «Тарасе на Парнасе», гэта не доказ праўдзівасці такой версіі. Адмаўленне кандыдатуры Фелікса Тапчэўскага было ў іншым. Здавалася б, ён мог бы ўзяцца за яе як паэт-гумарыст. Але, як пазней высвеціліся, гэты твор быў напісаны тады, калі Феліксу Тапчэўскаму было ўсяго 17 гадоў.

Рэдактар жа выдавецтва «Мастацкая літаратура» Пятро Шаўцоў прывёў сямейнае паданне, паводле якога «Тарас на Парнасе» напісаны нейкім беглым дзекабрыстам. Ён хаваўся пад імем Яхіма Крупенькі з Клімавіцкага павета на Магілёўшчыне. Такое паведамленне ў коле літаратуразнаўцаў усе ўспрынялі настолькі скептычна, што ніхто ўсур'ёз гэты варыянт нават не абмяркоўваў.

## Кожнаму свой час

Справа зрушылася з месца, калі Генадзь Кісялёў даведаўся ад Максіма Лужаніна, што ў адной з публікацый той пазнаёміўся з успамінамі аднаго з былых даваенных студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па сведчанні яго, выкладчык літаратуры, дэкан філалагічнага факультэта Міхаіл Піятуховіч на адной з лекцый пазнаёміў іх з рукапіснай копіяй паэмы «Тарас на Парнасе». Пры гэтым назваў і аўтара яе, тады нікому невядомага Канстанціна Вераніцына. Гэта і падказала Генадзю Васільевічу кірунак далейшых пошукаў, як і іншым даследчыкам.

Прыгадалася і меркаванне этнографа, фалькларыста, археолага Еўдакіма Раманава, які меркаваў, што аўтар «Тараса на Парнасе» — адзін са студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута (цяперашняя Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія). Еўдакім Раманавіч з захапленнем пісаў: «"Тараса" — усё роўна як "Сон Багародзіцы" — знойдзеш ува ўсякай хаце. Пісьменныя шчыра пішуць яго сабе на паперку, цёмныя яшчэ шчырэй вучаць яго на памяць».

Новыя перспектывы для асэнсавання твора і яго аўтарства адкрыла публікацыя Віталя Скалабана «Рукапісы А. Рыпінскага» ў літаратурна-гістарычным зборніку «Шляхам гадоў» (1990). У ёй пад рукапісам гэтай паэмы стаяла памета «Канстанцін Вераніцын. 14.4.1855. Гарадок». Захаваўся і яшчэ адзін твор Канстанціна Вераніцына — паэма «Два д'яблы», датаваная 7 красавіка 1860 года і з тлумачэннем, што напісана ў Маскве. Аднак, што ён калі-небудзь жыў там, даследчыкамі не ўстаноўлена. Затое ў Маскве пражываў яго брат Іван. Магчыма, будучы ў яго ў гасцях, і пісаў гэты твор. Ці дапрацоўваў тэкст яго з чарнавіка, а пасля зрабіў копію.

Сумненні ў аўтарстве «Тараса на Парнасе» адпалі. Заставалася знайсці звесткі пра яе аўтара.

## Быў «нічым», стаў «усім»

Нарадзіўся Канстанцін Верацінын 13 чэрвеня 1834 года. Але не ў цяперашнім раённым цэнтры Гарадку, а ў вёсцы Астраўляны, якая ў той час адносілася да Віцебскага павета аднайменнай губерні. Паселішча знаходзілася на востраве пасярод возера. З-за гэтага і пачалі вёску называць Астраўляны. Паводле легенды, возера называлася Лянэ. Па імені дачкі ўладальніка навакольных мясцін. Чаму ў яе было такое дзіўнае імя, невядома. Але сёння назва возера іншая.

Не Вераніцыным быў ад нараджэння, а Васільевым, а па бацьку Васільевічам. Яго маці належала да так званых дваровых людзей памешчыка Васіля Бондырава, які жыў у маёнтку Астраўляны. Ён валодаў вёскамі Макарава, Заходская, Сухарукава, Рыбакова, Шніцыны і Астраўляны, у якіх пражывала 267 сялянскіх душ. Па сённяшніх меркаваннях, уладальнік іх быў не з горшых паноў. Асабліва спагадліва ставіўся да Канстанціна, яго брата Івана і іх сястры, імя якой даследчыкі не ўстанавілі.

Вольную яны атрымалі яшчэ да таго, як было адменена прыгоннае права. Напрошваецца пытанне: чаму да іх Васіль Бондыраў ставіўся так спагадліва? Ды прычына ў тым, што прыхільна адносіўся да іх маці. Па-рознаму гэта можна ўспрымаць. Чулым быў, уважлівым, чалавечным… Якія хочаш эпітэты падбірай. Усе будуць праўдзівыЯ. Толькі асноўную прычыну так і не раскрываюць, бо чужая душа — поцемкі. Але, відаць, роднымі яны яму былі, таму так і ставіўся да іх. Разумеў, што ад яго залежыць — выб'юцца ў людзі ці паўторяць лёс шматлікіх бязбацькавічаў, да якіх нікому ніякай справы.

Вольную Канстанцін атрымаў у 11-гадовым узросце, а праз шэсць гадоў з падтрымкай Васіля Бондырава запісаўся ў мяшчане. Тады і памяняў сабе прозвішча, стаў Вераніцыным. Нязменная падтрымка ўладальніка маёнтка, а таксама тое, што ў далейшым аб яго лёсе клапаціліся яго родныя, лішні раз сведчыць, што быў для іх не чужым чалавекам.

Дарэчы, у прыходскай школе ў Гарадку вучыўся, калі яшчэ быў прыгонным. Стаўшы вольным, паступіў у Віцебскую губернскую гімназію. Потым была Пецярбургская медыка-хірургічная акадэмія. Аднак у ёй правучыўся толькі два гады. Паступіў на трэці курс Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Скончыў яго паспяхова, а атрымаўшы прафесію агранома, абараніў дысертацыю «Аб беларускай гаспадарцы».

За якія сродкі жыў — невядома. Магчыма, не абыходзілася і без падтрымкі Васіля Бондырава. Пасапраўднаму стаў на ногі, уладкаваўшыся пасля заканчэння інстытута ўпраўляючым аднаго з маёнткаў у Магілёўскай губерні. А ў 1874—1879 гадах працаваў выкладчыкам настаўніцкай семінарыі ў Маладзечне.

Недзе ў гэты час ажаніўся з удавой губернскага сакратара Лізаветай Поль. Невядома, ці былі ў іх дзеці. Ды вядома, што затым перабраўся ў Пецярбург. У Міністэрстве шляхоў зносін даслужыўся да стацкага дарадцы. Гэта быў пяты клас па рангу з 14, што існавалі ў Расійскай імперыі.

## Шлях у вечнасць

Пайшоў з жыцця 26 жніўня 1903 года ад кровазліцця ў мозг у Лясным пад Пецярбургам. І раней пахваліцца здароўем не мог. З-за тыфу і запалення лёгкіх звольніўся з працы ў настаўніцкай семінарыі. Між іншым, у Пецярбургу жыў у тым доме, дзе раней пражывалі Мікалай Някрасаў, Мікалай Чарнышэўскі, Іван Тургенеў. Рускую літаратуру ведаў добра. Гэта відаць і па тым, што на Парнасе галоўны герой сустракаецца з Аляксандрам Пушкіным, Міхаілам Лермантавым, Васілём Жукоўскім і іншымі пісьменнікамі. Адметна і тое, з якой павагай ставіцца да сялян. Невыпадкова, што ў творы багі падобны на іх.

Тым не менш, чыноўнік высокага рангу і пісьменнік у яго асобе існавалі як бы самі па сабе. З-за гэтага своеасаблівага раздвaення нікому не прызнаваўся, што яго не толькі вабіць прыгожае пісьменства, але і сам нешта напісаў. Ва ўсякім разе ніякіх сведчанняў накont гэтага не засталося. Гэта пры тым, што кантактаваў з многімі.




У чым прычына — адназначна не высветліш. Найбольш верагодна, што ўплыў аказвала штодзённая праца. Меркаваў, што захапленне літаратурнай творчасцю яго, чыноўніка высокага рангу, не ўпрыгожвае. Хоць, вядома, было нямала і пісьменнікаў-службоўцаў. Магчыма, давала аб сабе знаць звычайная сціпласць.

Ды загадкі загадкамі, а прыемна ўсведамляць, што ў беларускай літаратуры ёсць такі выдатны твор, як «Тарас на Парнасе». У не меншай ступені радуе і тое, што цікавасць да жыцця Канстанціна Вераніцына, яго творчасці не памяншаецца з боку не толькі чытачоў, але і даследчыкаў. У тым ліку і маладзейшага пакалення.

Творчасць Канстанціна Вераніцына працягвае жыць. Пра гэта сведчаць не толькі рэгулярныя перавыданні яго неўміручай творчасці — невялікай па колькасці, а такой значнай па мастацкай якасці, але і розныя мерапрыемствы, прысвечаныя яму. Як і трэба было чакаць, тон у гэтым задаюць яго землякі. Пра гэта засведчылі Вераніцынскія чытанні на Гарадоччыне, а з 1998 года праходзіць свята «Гарадоцкі Парнас». Як і звычайна ў падобных выпадках, актыўны ўдзел у ім прымаюць пісьменнікі. Знаходзіцца месца і ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці. Паколькі побач Расія, ахвотна наведваюцца і калектывы з Расійскай Федэрацыі — зямлі, гасціннасць якой, працуючы ў Пецярбургу, адчуў і Канстанцін Вераніцын.

* * *

Святкаванне на яго радзіме XXX Дня беларускага пісьменства — яшчэ адно пацвярджэнне таму, што яго паэзія жыве. Усе, хто далучыцца да мерапрыемстваў, яшчэ лепш адчуюць, наколькі непаўторны паэтычны свет, у які трапіў «Тарас, што палясоўшчыкам служыў». А таму такі ён, свет гэты, а не іншы, што ў беларускай літаратуры заўсёды працавалі, працуюць і будуць працаваць сапраўдныя таленты.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Абняліся лірыка з фізікай

## Пра «Дыядэмную споведзь» Соф'і Шах

**Беларускае вершаванне можна павіншаваць: у ім упершыню з'явілася надзвычай рэдкая, дагэтуль невядомая архітэктанічная форма — вянок вянкоў вянкоў санетаў, ці, па-іншаму, дыядэма вянкоў санетаў. Родапачынальніца гэтай формы — таленавітая паэтэса са Светлагорска Соф'я Шах. Гэтая архітэктанічная санетная канструкцыя — новая не толькі ў беларускай, але і ў славянскай і, бадай, ва ўсёй еўрапейскай паэзіі.**

У 1987 г. у 2-м выданні свайго «Паэтычнага слоўніка», растлумачваючы тэрмін «вянок санетаў» і прыводзячы як прыклад «Курганы» Анатоля Сербантовіча, я своеасабліва «правакаваў» паэтаў на напісанне яшчэ больш складанай формы — вянка вянкоў санетаў (ВВС), або кароны вянкоў санетаў. Прычым падкрэсліў, што «ва ўсходнеславянскай паэзіі такая форма адсутнічае», хоць і ведаў, што да таго часу некалькі рускіх паэтаў спрабавалі ўвесці яе ў паэзію. ВВС складаецца не больш і не менш як з 225 санетаў (!), кожны наступны з якіх пачынаецца апошнім радком санета папярэдняга. А магістрал займае цэлы ВС! Вось вам і еднасць фізікі і лірыкі… «Правакацыя» ўдалася. Праз чатыры гады ў друку з'явіліся першыя ВВС — беларуса Змітрака Марозава «Апакаліпсіс душы» і рускага Анатоля Мартынава «Благовест». Як сведчыць І. Катляроў (і не верыць яму нельга), за два гады перад тым ВВС «Адухаўленне» напісала і С. Шах. Аднак паколькі я ўлічваў толькі надрукаваныя творы (апублікавана ж «Адухаўленне» было ў 2000 г.), першынство ў стварэнні гэтай санетнай архітэктанічнай формы аддаў не ёй.




У 3-м выданні «Паэтычнага слоўніка» (2004) у асобным артыкуле пра ВВС, абапіраючыся на звесткі некаторых рускіх санетолагаў, я ўпершыню ў нашым вершазнаўстве сказаў і пра найбольш вышуканую форму — дыядэму вянкоў санетаў: «У 1994 г. рускі паэт С. Мінтаіраў стварыў дыядэму санетаў — архітэктанічную канструкцыю з 15 ВВС». Праўда, «дыядэма» С. Мінтаірава «Восхождение к…», відаць, да гэтага часу яшчэ не надрукавана: прозвішча яе стваральніка не значыцца ў «Электронном каталоге венков сонетов русской поэзии (1889—2015)» нават сярод аўтараў хаця б 20 ВС. Апрача таго, у С. Мінтаірава — не класічная дыядэма вянкоў санетаў. У яе складзе, па звестках тых жа санетолагаў, не толькі «чыстыя» ВС, але і палавінныя, храмыя, безгаловыя, хвастатыя, вянкі рубаі, віланелаў, трыялетаў, нават звычайных вершаў… На стварэнне дыядэмы вянкоў санетаў «замахнуўся» і А. Берднікаў, аўтар вершаванага рамана «Некий Муж, или Низложение Ренессанса» (2015). Але ў гэтым творы не 15 ВВС, а ўсяго толькі тры…

Усё сказанае і дазваляе першынство ў стварэнні дыядэмы вянкоў санетаў, прынамсі ў еўрапейскай паэзіі, аддаць беларускай паэтэсе С. Шах. І годам яе з'яўлення трэба назваць год выдання кнігі «Дыядэмная споведзь» — 2022. Хаця, па аўтарытэтным сцвярджэнні таго ж І. Катлярова, твор быў завершаны яшчэ ў 2019 г. Тады яго апошні, 15-ы магістральны ВВС, што ўвабраў 14 магістралаў папярэдніх ВС, быў змешчаны ў газеце «ЛіМ» (7 чэрвеня 2019 г.). Гэта, з аднаго боку, вывела С. Шах у лік галоўных творцаў беларускага санетарыя, а з другога — дазволіла мне ўвесці ў энцыклапедычны даведнік «Верш. Паэзія» (2020) спецыяльны артыкул «Вянок вянкоў вянкоў санетаў»…

Што ж уяўляе сабой «Дыядэмная споведзь» С. Шах? Уключае 3375 спалучаных паміж сабой апошнімі радкамі санетаў шэкспіраўскага тыпу (!), мае 47 250 радкоў (!) і сувымерны па памеры з такімі мастацкімі палотнамі, як «Боская камедыя» (1307—1321) Дантэ Аліг'еры, «Апантаны Раланд» (1516—1532) Лудовіка Арыёста, «Вызвалены Іерусалім» (1580) Тарквата Таса… Паводле жанру гэта дакументальная бытавая аповесць-медытацыя, напісаная ў форме 15 карон вянкоў санетаў. Медытацыйны пачатак яе вызначаецца шматлікімі псіхолага-аналітычнымі, часам філасофскімі разважамі пра многае, з чым паэтэса сутыкалася ў сваім няпростым жыцці. А там былі не толькі радасці, здабыткі, але і расчараванні, перажыванні, беды, за якія лёс нарэшце ўзнагародзіў яе святлом сапраўднага кахання, шчаслівага замужжа, значнымі мастацкімі (не толькі паэтычнымі, але і жывапіснымі) дасягненнямі, выдатнымі вучэбнымі поспехамі дачкі… Што да пачатку дакументальнага, то ён — у храналагічна паслядоўным выяўленні дакладных аўтабіяграфічных рыс, у пераліку тапанімічных назваў, многіх рэальных ВС і карон ВС, у аб'ектыўным прызнанні некаторых сваіх недахопаў, памылак, у асэнсаванні сутнасці ўласных паводзін, характару, хібаў і г. д. Адным словам, ва ўсім, што ўключае ў сябе паняцце «споведзь». Сапраўды, С. Шах санетнай дыядэмай шчыра паспавядалася перад Богам і чытачамі за ўсё перажытае, здзейсненае, страчанае і здабытае. Як слушна заўважыў І. Катляроў, «толькі так асабістае перастае быць уласным і набывае мастацкае абагуленае ўвасабленне».

Кожны з 14 ВВС «Дыядэмнай споведзі» прысвечаны нейкаму этапу ці праблеме жыцця яе аўтаркі, што звычайна (але не заўсёды) вычытваецца з саміх назваў карон вянкоў санетаў. Вось яны: **1. «Жылі калісьці продкі на зямлі…»** — пра далёкіх і блізкіх продкаў паэткі. **2. «Жылі бацькі мае не надта плённа…»** — аповед пра гаротнае пасляваеннае жыццё бацькоў. **3. «З'явілася і я нібы з палону…»** — чаму «нібы з палону»? Палонам была кутузка, куды пасадзілі маці «з-за хлеба, з-за кавалачкаў нічыйных», узятых употай у сталоўцы ў галодным пасляваенным сорак сёмым годзе. Але, піша паэтэса, пакольні «мне нарадзіцца набліжаўся час… датэрміновa выпусцілі нас». **4. «А потым школьныя гады пайшлі…»** — успаміны пра школьнае навучанне. **5. «Ужо вось і студэнтка ў Мазыры…»** — вучоба на факультэце пачатковых класаў Мазырскага педінстытута. **6. «Ужо вось, самастойная, працую…»** — праца ў аддаленай палескай вёсцы «чатыры сельска-даўнія гады», у час якіх «хлапец прыкмеціўся на танцах» і — «падумала, што долечку ладкую»… **7. «Вяртаюся ў Азарычы, гарую…»** — вяртанне ў родныя Азарычы з двухгадовай дачкой, праца ў дапаможнай школцы суседняй вёскі, пачатак паэтычнай творчасці (на рускай мове). **8. «На ўсё яшчэ няўцямленай пары…»** — завочная трохгадовая вучоба ў тагачасным БДПУ імя М. Горкага на дэфекталагічным факультэце, урачыстыя праводзіны дачкі ў першы клас, хвароба і смерць маці, з якой так і не наладзіліся цёплыя душэўныя адносіны. **9. «І ўзнік па волі Божай Светлагорск…»** — нечаканы пераезд у Светлагорск, сустрэча ў рэдакцыі раённай газеты з І. Катляровым. Шчырае прызнанне ў каханні да будучага мужа. Заканчэнне дачкой Людмілай сярэдняй школы з залатым медалём, выбар для далейшага навучання філасофскага факультэта Ленінградскага ўніверсітэта. **10. «Санкт-Пецярбург, на вабы адмысловы…»** — услаўленне Санкт-Пецярбурга, куды паехала вучыцца дачка, трывога за яе лёс, якой па спадчыне перадала сваю «палыновую планіду». Дачка без шлюбу нараджае ўнучку. **11. «Паэзія і жывапіс — аснова…»** — радасць ад узаемакарыснага творчага самавыяўлення ў словах і фарбах. Дарэчы, «Дыядэмная споведзь» ілюстравана малюнкамі самой С. Шах. Гімн роднай мове. Радасць ад сямейнага шчасця. **12. «Праз настальгіі покліч-адгалос…»** — «пяюха споведных вянкоў», як называе сябе паэтка, праходзіць настальгічнай памяццю скрозь усе этапы свайго жыцця, раскайваецца ў асобных сваіх грахах. **13. «І я — нібы з раздвоеным іспытам…»** — Адзін іспыт: «мінулае ўсё не дае спакою…». Другі іспыт — «сучаснае… // мне прад'яўляе ўжо свае правы». Выхад? «Адно на свой і спадзяюся дух. // У ім патрэбу мае мой каханы; // дачка і ўнучка ў краі тым туманным; ім я найперш — выратавальны круг». **14. «Жыву далей, аддаўшыся малітвам…»** — шчырыя і розныя малітвы, з якімі паэтэса «ў Госпадні мкне пагляд». **15. «Магістрал»** — ВВС, што ўвабраў у сябе магістралы ўсіх папярэдніх санетных карон.

Такая фабула «Дыядэмнай споведзі» С. Шах. Яе надзвычай шчыры і падрабязны «дыядэмны сп376овед-сказ, храналагічны і вянкоўвянковы», усюды вядзецца ад імя «Я» паэтэсы. Яна «выгортвае, выструньвае душу». Перад намі, па сутнасці, тонкі псіхааналіз, і сама С. Шах выяўляе сябе арыгінальным псіхааналітыкам, што, дарэчы, у паэтычным эпасе (у адрозненне ад празаічнага) сустракаецца не так часта. І абумоўлена гэта, відавочна, не толькі своеасаблівасцю яе таленту, але і глыбокімі псіхолага-педагагічнымі ведамі, набытымі падчас навучання ў двух педагагічных інстытутах.

Споведзь у С. Шах нярэдка пераходзіць у развагі, глыбокі роздум на самыя розныя актуальныя тэмы: пра жыццё як «супярэчнасцей адзінства», патрыятызм, спадчыннасць, экалогію, сувязь чалавека з малой радзімай (дакладней — родным кутом), пра ўзаемаадносіны дзяцей і бацькоў, прынцыпы выхавання, сутнасць, псіхалогію і нават фізіялогію творчасці, узаемасувязь паэзіі і жывапісу, своеасаблівасць паэзіі як мастацтва слова, розныя формы санета, санетных вянкоў і многае іншае. Пры гэтым яна нярэдка ўплятае ў свой аповед дзясяткі літаратурных і літаратуразнаўчых паняццяў, што дазваляе выкарыстаць некаторыя старонкі «Дыядэмнай споведзі» нават у якасці навучальнага матэрыялу для філолагаў па курсах «Тэорыя літаратуры» і «Псіхалогія мастацкай творчасці». Я ўжо не кажу, што і звычайны чытач можа ў многім літаратуразнаўча ўзбагаціцца, чытаючы тыя ці іншыя санеты.

Па законах мастацкай тыпізацыі выказанае і выяўленае аўтарам у вершаваных радках пра сябе і для сябе становіцца абагульненым, усюдысным, тыповым. Як, напрыклад, у сцвярджэнні патрыятычных перакананняў. Паэтэса ганарыцца сваім народам: «Сцвярджаю не адна ўжо сотня год: // мы ўдумлівы, разважлівы народ». Яе штодзённая турбота і як педагога, і як паэта — «Каб выраслі ад душэўнай моцы // з таленавітай нашай дзетвары // сапраўдных спраў сапраўдныя майстры // і любае Радзімы абаронцы». Паэтэса заклікае помніць, «якой цаной здабытая свабода, // якая плата за збавенны мір».

***Што ж уяўляе сабой «Дыядэмная споведзь» С. Шах? Уключае 3375 спалучаных паміж сабой апошнімі радкамі санетаў шэкспіраўскага тыпу (!), мае 47 250 радкоў (!) і сувымерны па памеры з такімі мастацкімі палотнамі, як «Боская камедыя» (1307—1321) Дантэ Аліг'еры, «Апантаны Раланд» (1516—1532) Лудовіка Арыёста, «Вызвалены Іерусалім» (1580) Тарквата Таса… Паводле жанру гэта дакументальная бытавая аповесць-медытацыя, напісаная ў форме 15 карон вянкоў санетаў. Медытацыйны пачатак яе вызначаецца шматлікімі псіхолага-аналітычнымі, часам філасофскімі развагамі пра многае, з чым паэтэса сутыкалася ў сваім няпростым жыцці.***

Патрыятычнае, як і ў іншых таленавітых прадстаўнікоў нашай творчай эліты, у паэткі цесна звязана з нацыянальна-беларускім. Можна зразумець яе клопат, каб маладыя «чулі мілагучча роднай мовы», «каб дух нацыянальнасці ўваскрос…». Як і ў любой іншай нацыі, у беларусаў родная мова ўваходзіць у склад самых важных нацыянальных ідэнтыфікацыйных асаблівасцей, чыннікаў гістарычнай памяці. Як некалі слушна сказаў Алесь Разанаў, у кожнага народа ёсць прынамсі адзін геніяльны твор — родная мова. І паэтэса заклікае захоўваць гэты твор, як гэта рабілі ў свой час і Францішак Багушэвіч, і Янка Купала, і Максім Багдановіч, і Максім Танк, і ўсе іншыя буйныя беларускія творцы.

Але С. Шах — што да роднай мовы — не абмяжоўваецца толькі заклікамі берагчы і шанаваць яе. Паэтэса самой сваёй споведдзю выяўляе вялікае лексічнае і граматычнае багацце беларускай мовы. Лексікон яе настолькі грунтоўны і разнастайны, што дыядэма вянкоў санетаў не можа быць абыдзена ўвагай беларускіх лексікографаў. Яна даволі часта, калі не хапае патрэбных слоў, звяртаецца да неалагізацыі, аўтарскіх наватвораў. Прычым усе яны сэнсава зразумелыя. Толькі пісьменнік, які, умоўна кажучы, купаецца ў моўнай стыхіі, можа так вольна, смела і дарэчы абыходзіцца са словам.

У «Дыядэмнай споведзі» неаднойчы С. Шах шчыра прызнаецца мужу ў сваёй вялікай павазе, глыбокім каханні да яго, нават ідэалізуе Ізяслава: «Няма ягонай мудрасці мяжы, // раз талент з геніяльнасцю такою». А калі муж, старэйшы за жонку на 10 гадоў, цяжка захварэў, Соф'я стала прасіць-маліць Госпада: «Здароўя мужу дай, каб не слабеў, // каб ён магчымасць гэтакую меў».

На жаль, малітвы не дапамаглі: у першай палове гэтага года Бог забраў Ізяслава да сябе. Светлая яму памяць! Выказваю Соф'і Шах шчырае спачуванне. З гэтага часу, прынамсі для мяне, яе санетная дыядэма ўспрымаецца, апрача ўсяго, і як шчымлівы рэквіем па самым блізкім каханым чалавеку.

**Вячаслаў РАГОЙША**

# Філакартычнае прачытанне Віцебшчыны

**Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Ліхадзедаў у асяроддзі творчай інтэлігенцыі краіны — асоба вядомая. Яго краязнаўчыя публікацыі даволі часта з'яўляюцца ў перыядычным друку. У супольнасці з іншымі даследчыкамі і самастойна Уладзімір Аляксеевіч выдаў некалькі дзясяткаў філакартычных альбомаў і кніг, дзе поруч з публіцыстычнымі тэкстамі суседнічаюць красамоўныя рэпрадукцыі старых паштовак, рознага характару графічных ілюстрацый, фотаздымкі з розных перыядаў айчыннай гісторыі. Выданні, якія пабачылі свет у цэлым шэрагу выдавецтваў (Выдавецкі дом «Звязда», «Мастацкая літаратура» і інш.), адлюстроўваюць пэўны гістарычны адрэзак часу альбо прысвечаны пэўнай тэматыцы, асвятляючы не на працягу даволі доўгага адрэзку часу. Істотная частка альбомаў У. Ліхадзедава — кнігі, якія з дапамогай старых паштовак расказваюць пра тую ці іншую мясціну Беларусі.**


*Лужасна. Землеробчая школа. Пачатак XX ст.*




Новае выданне збіральніка гістарычных памятак — альбом «Ад Віцебска да Полацка». Выпуск яго прымеркаваны да XXX Дня беларускага пісьменства ў Гарадку. На старонках кнігі — рэпрадукцыі старых паштовак, якія «прывязаны» да тых ці іншых канкрэтных адрасоў. Найбольшы масіў артэфактаў прысвечаны губернскаму Віцебску (усяго 64 паштоўкі). Першыя шэсць старонак з рэпрадукцыямі 12 паштовак — сувенірная прадукцыя пачатку XX стагоддзя. Па змесце іх можна аб'яднаць агульнай характарыстыкай: «Прывітанне з Віцебска». Так яно і ёсць: на большасці паштовак аддрукаваны менавіта гэтыя словы. Агульны выгляд Віцебска паказваюць каляровыя прадметы паштовай карэспандэнцыі. Здымкі, якія сталі асновай паштовак, надзвычай якасныя, і болей чым праз стагоддзе выразна даносяць да нас многія дэталі. Вельмі шматбасяжнымі, кампазіцыйна шырокімі падаюцца выявы Параходнай прыстані, моста праз раку Дзвіну, а таксама — мост праз Віцьбу, від на горад з Успенскай гары, від на горад з набярэжнай, месца сутокаў рэк Дзвіны і Віцьбы… Несумненна, такія паштоўкі надзвычай красамоўныя, адразу падштурхоўваюць параўнаць мясціны горада ўчора і сёння. Дарэчы, у некаторых сваіх альбомах Уладзімір Ліхадзедаў выкарыстоўваў і такі прыём — змяшчаў побач рэпрадукцыю старой паштоўкі і сучасны фотаздымак той самай мясціны. Далёка не заўсёды сучаснікі знаходзілі падабенства, такія параўнанні штурхалі да многіх развагі і нават да краязнаўчага пошуку…

Ужо гартаючы старонкі з фатаграфічным, філакартычным расповедам пра Віцебскі раён, бачыш і адрознасць ілюстрацыйнага матэрыялу. Выявы паказваюць нам старыя сядзібы, ілюструюць гаспадарчае жыццё ў гэтых сядзібах і маёнтках. Здымак землеробчай школы ў Лужасне разглядаць не меней цікава, чым сядзібу расійскага мастака І. Я. Рэпіна «Здраўнёва». Асобную гісторыю паказваюць выявы з Янавіч: сядзібны дом, парк зімою, гасцёўня ў сядзібным доме, Вышэйшае пачатковае вучылішча ў Янавічах, адрэзак Віцебскай шашы каля Янавіч…

Знаёмства з паштоўкамі, іншым фатаграфічным матэрыялам у выданнях У. Ліхадзедава прымушае выбудоўваць уласны краязнаўчы пошук. Узнікае жаданне даведацца штосьці пра тое ці іншае паселішча, адкрыць для сябе лёс збудаванняў, разгледжаных на паштоўках стогадовай даўнасці. Янавічы і сёння (у 2022 годзе тут прайшоў раённы фестываль-кірмаш «Дажынкі»), і сто гадоў назад (на працягу года праходзілі два вялікія кірмашы, куды з'язджаліся не толькі з навакольных паселішчаў, але і




з Віцебска, Суража, а таксама з Невеля) былі эпіцэнтрам жыцця. Дарэчы, з 2006 года паселішча мае свой герб: «…у блакітным полі іспанскага тарча дзве сярэбраныя перавязі, пакладзеныя Андрэеўскім крыжам, у верхняй частцы поля — залатыя шалі». Янавічы — радзіма Героя Савецкага Саюза Рыгора Саламонавіча Гарфункіна, ваеннага дзеяча, генерал-лейтэнанта Майсея Іосіфавіча Сладкевіча, рэвалюцыянера, грамадскага, дзяржаўнага дзеяча Міхаіла Маркавіча Барадзіна, які ў 1923—1927 гады быў палітычным саветнікам ЦВК Гаміньдана, арганізоўваў саюз паміж Гаміньданам і кітайскімі камуністамі, быў сябрам Сунь Ятсена…

Да якіх яшчэ адрасоў вядуць нас паштоўкі з альбома Уладзіміра Ліхадзедава «Ад Віцебска да Полацка»?.. Вельмі шмат рэпрадукцый — з Оршы і Аршанскага раёна. Вядомыя і меней вядомыя паселішчы — Барань, Вусце, Гародня, Высокае, Копысь, Межава, Смаляны… Расповед пра Бешанковіцкі раён складаецца не толькі з паштовак. Пададзены і рэпрадукцыі літаграфій па малюнках Х. В. фон Фабера дзю Фора. Многія ілюстрацыі прысвечаны Бачэйкаву, Уле. А яшчэ — Браслаў, Відзы, Друя, Дрысвяты, Опса… Відавочна, што кніга такога характару павінна быць найперш у агульнаадукацыйных школах Віцебшчыны. Яе старонкі паспрыяюць вывучэнню мясцовасці, дапамогуць настаўнікам знайсці прыклады-ілюстрацыі рэгіёназнаўчага характару, паспрыяюць развіццю краязнаўчых зацікаўленняў вучняў.

Пра Гарадок і Гарадоцкі раён болей, чым паштоўкі, расказваюць старыя фотаздымкі. Сюжэты іх на першы погляд даволі простыя: «Мясцовыя жыхары пасля работ па добраўпарадкаванні парку. Пачатак XX стагоддзя»; «Выхаванцы дзіцячага дома перад ад'ездам на працаўладкаванне»; «Езярышча. Маці з дачкою»; «Гарадок. Мясцовыя жыхары…» Але і яны прыцягваюць увагу — пачынаеш разглядаць вопратку нашых прашчураў, задумваешся над тым, якога сацыяльнага статусу персанажы на той ці іншай выяве… Сорак ілюстрацый — Мёры і Мёрскі раён! Лічы, асобная кніга… Можа, і сапраўды, у выпадку, калі паштовак, старых фотаздымкаў даволі шмат, якому з нашых выдавецтваў варта парупіцца пра выданне філакартычных альбомаў, прысвечаных асобным раёнам. Выдаў жа Уладзімір Ліхадзедаў кнігі, якія расказваюць пра Навагрудак, Слонім, Ліду, іншыя гродзенскія рэгіёны. А па Віцебшчыне такія кнігі можна было б выдаць у іншым фармаце — з болей шырокім тэкставым расповедам пра той ці іншы край… У апошнія дзесяцігоддзі айчыннае кнігавыданне звярнула ўвагу на краязнаўчую літаратуру. Кніг, прысвечаных тым ці іншым мясцінам, выходзіць даволі шмат. Але многія з выданняў такога характару не лепшым чынам ілюстраваны, не вельмі высокай якасці з пункту гледжання дызайну кнігі, яе паліграфічнага выдання. Чаму б аднаму-двум дзяржаўным выдавецтвам не скласці асобную праграму краязнаўчага, рэгіёназнаўчага кнігавыдання?..

Гартаючы ўшацкія старонкі новага альбома У. Ліхадзедава, сустракаеш нямала культавых пабудоў. «Ушачы. Царква», «Ушачы. Царкоўная вуліца», «Ушачы. Будаўніцтва касцёла», «Белае. Касцёл», «Белае. Касцёл. Унутраны выгляд», «Рукшэніцы. Касцёл Апекі Маці Божай», «Рукшэніцы. Унутраны выгляд касцёла Апекі Маці Божай», «Селішча. Касцёл Святой Веранікі», «Селішча. Унутраны выгляд касцёла Святой Веранікі»… Даволі цікавая вымалёўваецца прастора для экскурсіі тэматычнага характару — па адрасах праваслаўных цэркваў і каталіцкіх касцёлаў, па адрасах мясцін, дзе яны некалі стаялі, збіралі людзей, упрыгожвалі ваколіцы… І гэтая згадка пераконвае ў яшчэ адной вартасці працы, якую нястомна, дзесяцігоддзямі робіць Уладзімір Аляксеевіч, — сабраны ім ілюстрацыйны матэрыялам можа і павінен служыць асновай для распрацоўкі турыстычных маршрутаў, фарміравання зместу экскурсій.



*Віцебск. Сувенірная паштоўка. Пачатак XX ст.*

…Кніга «Ад Полацка да Віцебска» пабачыла свет у межах рэалізацыі сумеснага асветніцкага праекта Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. Выдавец — Выдавецкі дом «Звязда». Тыраж — 1000 экзэмпляраў. Пэўна, у такіх выданняў павінны быць і большыя тыражы. Чаму б не прадаваць іх у кнігарнях краіны на працягу двух-трох гадоў, з разлікам, што зацікаўленасць у такой літаратуры праявіць болей шырокае кола нашага грамадства?..

**Максім ПЯСЧАНСКІ**


*Гарадок. Мясцовыя жыхары. Пачатак XX ст.*

# «Над марнасцю жыццёвай…»

***Напярэдадні Дня беларускага пісьменства традыцыйна прадстаўляем творчасць той мясціны Беларусі, дзе мае адбыцца ўрачыстасць. Яны розныя, паэты Прыдзвіння, але яднае іх зямля, якая нарадзіла і ўзгадавала таленты, жывіць натхненне. На нашай паэтычнай старонцы — вершы толькі некалькіх прадстаўнікоў гэтага таленавітага краю, а каб атрымаць больш поўнае ўяўленне аб сучаснай літаратуры Віцебшчыны, раім пачытаць літаратурны альманах «Дзвіна. Віцебшчына літаратурная», што днямі пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда».***

## Галіна ЗАГУРСКАЯ

### Прыцяжэнне маўчання

*Пяшчотны спеў ветру ў соснах
І шорах таемны галін
Заўжды суцяшаюць ускосна,
Калі застаешся адзін.*

*Калі цябе цягне маўчанне —
І ты пазбягаеш усіх,
Нішто не ідзе ў параўнанне
З маўклівасцю соснаў сівых.*

### Час

*Час — наш вораг і саюзнік,
Ўсё залежыць ад абставін:
То ў ім горача, бы ў кузні,
І гатоў ён нас расплавіць;
То халодны ён, марудны:
Ні падзей, ні узрушэнняў,
І яму таксама нудна —
Сам шукае суцяшэння.*

## Ганна ЗІНКЕВІЧ

### Шчасце

*Жоўтыя гарлачыкі ў рацэ.
Прыгажосць і радасць незямная!
Шчасце ёсць! Яно ў маёй руцэ,
Я яго на волю адпускаю.
Сонечны гарэзлівы прамень
Узляцеў і загучаў санатай,
Сонцам заіскрыўся летні дзень,
Хмаркаю павіс над роднай хатай.
І праліўся залацісты дождж,
Уздыхнула радасна прырода.
Шчасце ёсць! І мы на свеце ёсць!
Гэта нам Нябёс узнагарода.*

***

*Не прыляцелі снегіры
На пачастунак да рабінак,
Кусліва-злосныя вятры
Сарвалі ягады з галінак.*

*Такі ў гэткай зімкі лёс —
Чарнеюць мёрзлыя ўзмежкі,
Разгульны вецер і мароз,
І снег з пяском упрамешку.*

*Дзе ты, чаканая вясна,
З цяплом пралескі сінявокай?
Нясецца слізкая вярста,
І да вясны яшчэ далёка…*

## Міледзій КУКУЦЬ

### Мая Дзісёнка

*Бы стужку ветрык развявае —
Каля Шаркоўшчыны ў лагі
Цячэ Дзісёнка, падмывае
Свае крутыя берагі...
Зачараваны я ракою!
Няма мясціны прыгажэй.
Сярод чаромхі раніцою
Спявае звонка салавей.
Узрэчча ў маі заквітнее —
Дзе ўбачыш столькі хараства!
Ад паху кветак захмялее
І пойдзе кругам галава.
Душой высока я лунаю,
Калі любуюся ракой.
Сваё маленства ўспамінаю
І сэрца першы неспакой.
Цячэ, вірыць мая Дзісёнка,
Такая светлая заўжды,
Гартае яркія старонкі
Майго жыцця — мае гады...
На хвалю хвалі набягаюць,
Спяшаюцца за быстрынёй,
І ранкам сонца сустракаюць
Ужо абнятыя Дзвіной.*

***

*Белы снег пакрывае сляды і гады,
Што імклівa бягуць у тваё небыццё.
Іх не варта лічыць, іх спяшайся пражыць,
Бо жыццё — адзін раз, а гады —
Як прачытаны сказ.*

*І не будзем ліць слёз
Ды ківаць на свой лёс.
Мы жылі,
Як маглі.
Адзін Бог нам суддзя.*

## Віктар ЛАГУН

### Другое вымярэнне

*Як на гадзінніку звядзе
Сумесна стрэлкі поўнач,
І адлюструецца ў вадзе
Сярэбраная поўня,
У звона чуйнай цішыні
Прашу благаславення
І ўзношуся да вышыні
Другога вымярэння,
Пакінуўшы начны спакой,
Адкінуўшы ваганні,
Каб акунуцца з галавой
У вір пераживанняў,
Каб, бесцялеснаму, плысці
Над марнасцю жыццёвай
І на шляхах яго знайсці
Патрэбныя мне словы, —
Што абуджаюць цішыню,
Іскраца ад гарэння,
Нясуць з сабою дабрыню,
Спагаду, суцяшэнне...
Як толькі ранак задрыжыць,
І знікнуць ночы цені,
Я раскажу, што перажыў
У іншым вымярэнні.*

### Услед за думкай

*Куды кіруе думка свой палёт? —
Услед спяшаюся за ёй і — не спраўляюся...
Вітаю сонца яснага ўзыход
Ці гэта сам зарою разліваюся?*

*«Ты прызямліся, стане ўсё працей, —
Вунь думка просіцца. —
«Бяры, я танная,
А злоўленая ў небе — абрасце
Ліпучымі адвечнымі пытаннямі...»*

*Патраціў сілы, час, пераплаціў.
Узнёсшыся імклівымі патокамі,
Нагнаў яе, ўцякачку, я, злавіў, —
Загадкавую, ўзнёслую, высокую.*

*І застаюся з ранку да цямна
Сам-насам прад пытаннямі адвечнымі...
Пра што звініць кранутая струна? —
Пра тое, што й яна не вечная.*

## Ігар ПРАКАПОВІЧ

***

*Стаяла біблейскае лета.
Па небе, што сонцам сагрэта,
Павольна плылі аблачынкі.
На вузкай вясковай сцяжынцы
Бабулька сівая сядзела,
На неба самотна глядзела,
Як быццам кагосьці чакала
І ціхенька-ціха шаптала:
«Дай, Божа, спакою ў свеце…
Хай будуць шчаслівыя дзеці…
Хай цешуцца сонцам і небам…
Хай будуць і з бульбай, і з хлебам…
І хай жа з далёкага краю
Дарогу дамоў адшукаюць.
Бо ёсць яшчэ ў вёсцы хацінка,
Куды не ўтравела сцяжынка…»*

***

*У жніўня вочы затуманены
І белы смутак у вачах,
Бо дні прыгожыя прапалены
Зжаўцелай фарбай на лістах.*

*І сэрцу крыху сумна робіцца,
Бо час ідзе, ідуць гады.
Вось хутка гэты месяц скончыцца
І зноў прыцісннуць халады.*

*Пад небам у палях заснежаных
Душэўны адаб'еца цень,
Сляды па снезе — раны-плешыны,
Будуць чарнець і ўноч, і ўдзень.*

*І за прасторамі сумётнымі
Ні слоў, ні з'яў не адшукаць.
Мы будзем шэрымі, самотнымі
У невядомасці блукаць.*

*А ў час, як з'явяцца прагаліны,
Забудзем у вясенніх днях,
Што ў жніўня вочы затуманены
І белы смутак у вачах…*

## Ірына РАДЗІХОЎСКАЯ

***

*Спіць зямля. Горад спіць. Спяць кватэры.
Сны сплятаюцца з зорным святлом.
Свечкі полымя ліжа паперу
Над старэнькім драўляным сталом.
Нішчыць словы агеньчык дрыготкі,
Нібы моц у ім ёсць для таго,
Каб сціраць нагаворы і плёткі,
І пачуцці, і веру ў багоў.*

*Што мацнейшае: свечка ці Слова?
Што пакіне свой след у вяках?
Дзе ўсёй мудрасці свету аснова,
Дзе шаленства займела размах?
Горад спіць, зорным пылам пакрыты.
Попел шэры сабраны ў далонь —
Сцерлі словы. Агарак забыты
На стале. Бо задзьмулі агонь.*

***

*Чашчобай глухою, паўз шызыя плёсы
Крадзіся, спяшайся.
Шукай
Кахання, багацця, шчаслівага лёсу.
У цемры хавайся,
Чакай,
Як знікнуць прымары, як зоркі сыдуцца,
Раскрыецца кветка —
Бяры.
Расступяцца дрэвы, кусты расхінуцца,
Заб'юцца ў клеткі
Звяры.
Вяртайся дадому і шэпту не слухай,
І не аглядайся,
Не смей.
Стань першым,
хто кветку змог скрасці ў духаў,
Адзіным застанься
З людзей.*

## Вольга РУСІЛКА

***

*— Нішто сабе!
Ніхто табе
ніколі і нідзе
не скажа,
за якой бядой
па свеце ён ідзе.*

*Не ведае,
не думае,
баіцца звар'яцець.
А я вось,
на бяду маю,
спрабую зразумець.*

*Тапчу бяду
пастылую,
абцасамі душу.
Гадую
легкакрылую
спагадную душу.*

***

*Мае лепшыя вершы напісаны
І пяром, і маланкай, і промнем.
На калючкі бяссонніц нанізаны,
Палавіну сама ўжо не ўспомню.
За асцё светлых мар зачапіліся,
Патанулі ў начной цішыні…
Ну, а можа, камусьці прысніліся,
Зварухнулі звычайныя дні?*

## Надзея САЛОДКАЯ

***

*«Ты павяртайся да роднага слова, —
Мудра параіў шаноўны паэт, —
Там святаянны напой, верасовы,
Там неўміручы даверлівы свет…»*

*Вёска гамоніць на ёмкай трасянцы,
Сем'і цнатліва сябе берагуць,
Там яшчэ маюцца нейкія шанцы,
Там я са словам радніцца магу…*

*Сонейка, зернейка, сейбіт, араты…
Шэпт збажыны на ўрадлівых палях…
У палісадзе вяргіні пад хатай,
Хату вартуе раскрылены птах…*

*Я не пакрыўдзіла здрадай і злосцю
Матчыну мову — я маю іх дзве
І павяртаюся прошаным госцем
У свой радзінны даверлівы свет.*

***

*Горкіх рабін нераспелаю гронкай
Стукнула восень у вокны мае.
Па перадзімку пявуча і звонка
Гушкае вецер трывогу-спадзеў.*

*Сталі гады непадкупнаю вартай,
Цэнзарам пільным абуджаных слоў.
Сёння і ўчора скрахаліся ў заўтра,
Промень цямнюткую ноч раскалоў.*

*Заўтрашні дзень — адгалосак учора,
Страт і набыткаў, спакусаў, надзей.
А над зямлёй перавернутым чоўнам
Ветах старэнькі няпэўна брыдзе.*

## Тамара ТАЛКАЧОВА

***

*Наталю сваю смагу світанкам.
Вып'ю золак да самага донца.
З маладзенькім разбуджаным ранкам
Дачакаюся промніка сонца.*

*Я пабачу яго нараджэнне
Ў бяздоннай, бязмежнай сінечы,
І пачнецца душы адраджэнне,
І імгненна распрамяцца плечы,*

*І ракою святло разальецца
Па застылых у цемры абшарах,
І зазззяе ўсё раптам. Здаецца,
Што ты быццам у казцы, ці ў марах.*

*Ажыве скамянелае сэрца
Ад свята і ад шчасця такога,
І пяшчотаю ўраз адгукнецца…
І не трэба ўжо болей нічога!*

*Наталю сваю смагу світанкам.
Вып'ю золак да самага донца.
З маладзенькім разбуджаным ранкам
Дачакаюся промніка сонца.*

### Міждзённе

*Нуль гадзін і нуль хвілін…
Так няўтульна і трывожна,
Нібы ў сэрца маё клін
Нехта ўбіў неасцярожна.
Нібы разарваўся час —
Праз нулі зірнула вечнасць.
Нібы ясны месяц згас,
Палілася з неба млечнасць
На красу зямных нізін…
Але нулік захістаўся
І пачаўся бег хвілін —
Значыць, новы дзень пачаўся!*



Георгій МАРЧУК

# Дзяцінства

## Урывак з рамана-хронікі «Божы дар»

**На мінулым тыдні пакінуў зямное жыццё лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, празаік, драматург, сцэнарыст Георгій Марчук. Але пісьменнік жыве, пакуль жывуць яго творы, пакуль іх друкуюць і чытаюць. Прапануем вашай увазе ўрывак з рамана-хронікі яго жыцця, з якім можна будзе пазнаёміцца ў найбліжэйшых нумарах часопіса «Полымя».**

Не ведаю, як у каго, а майму натхненню дапамагае прырода, асабліва зімовая, можа, таму, што я нарадзіўся ў першы дзень зімы — першага снежня 1946 года. Люблю снег, дождж, мокры снег, вецер, адлігу. Пачынаю свой аповед, а за акном — густы снег, ну як тут не прыгадаць дзяцінства, калі цябе неадольна цягнула на вуліцу, да снегу? Калі я нарадзіўся, майму дзеду Змітру Міхайлавічу Асколку было пяцьдзясят восемь гадоў, бабулі Анастасіі Якаўлеўне Асколцы (Калько) пяцьдзясят чатыры, а маці Марыі Дзмітрыеўне — дваццаць шэсць гадоў. Пра сваякоў з боку бацькі, Васіля Ільіча Марчука, ведаю вельмі мала, чаму — раскажу пасля. Баба Ганна магла быць адных гадоў з маёй бабаю, як і дзед Ілья — адных гадоў з маім дзедам. У Ільі і Ганны было трое дзяцей — два сыны і дачка Соня. Адзін з сыноў рана памёр, а Соня пасля вайны з'ехала ў Канаду. Бацьку майго ў 1944 годзе прызвалі ў войска, і ён дабіваў фашыстаў у час Вялікай Айчыннай вайны.

Меў дачыненне да вайсковай службы і дзед Ілья — быў, як казалі, царскім пісарам пры штабе арміі ў 1914 годзе. Разам з ім служыў і родны брат маёй бабы Насці наш сусед дзед Іван Калько. Яшчэ бацька мне казаў, што дзед Ілья ўмеў пісаць вершы. Вось і ўсё, што ведаю пра дзеда Ілью і бабу Ганну. Мой дзед Змітрок да вайны 1914 года заснаваў з давыд-гарадоцкім яўрэем сваю лаўку-фірму і меў гандаль на мяжы Царскай Расіі і Нямеччыны. Бабуля Насця з нованароджанай дачушкай Аленай на руках як магла дапамагала ім. Вайна 1914 года, як кажуць, ператасавала ўсе карты і кардынальна змяніла іх жыццё. Яны мусілі вярнуцца ў Давыд-Гарадок і пачынаць усё з пачатку. Дзед хутка авалодаў прафесіяй шаўца. А яго жонка нарадзіла сына Рыгора — імя далі ў памяць прадзеда. Яна вяла гаспадарку, была, як кажуць у нас, «пры хаце».

Мая прабабка Таццяна жыла з дачкой Мартай на суседняй вуліцы, блізка ад нашай хаты. Мой прадзед Міхайла Асколкаў, па адной версіі, быў родам з Расіі, меў прафесію землямера, і калі ў 1885 ці ў 1886 годзе прыехаў мераць зямлю ў Давыд-Гарадку, дык і пазнаёміўся са статнай і прыгожай гарадчанкай Таццянай. Як казаў мне мой дзед, іх сын, Таццяна карміла землямераў надта ж смачным баршчом. Я пасля інстытута шукаў паходжанне прозвішча Асколка, Асколкаў (Асколков)... Знайшоў. Людзі, якім давалі яго, былі хударлявыя, рухавыя. Трэба адзначыць, што мой прадзед Міхайла быў на галаву ніжэйшы за сваю жонку Таццяну. Ён мяне не дачакаўся. Памёр яшчэ перад Другой сусветнай вайной. У яго былі праблемы з псіхікай. А вось прабабка Таццяна, як казала мне маці, прыходзіла пагушкаць мяне малога на сваіх каленях. Бацька пакінуў маю маці, не дачакаўшыся майго нараджэння, пайшоў да іншай жанчыны. Пазней, калі праз сямнаццаць гадоў я нарэшце сустрэўся з ім, пачуў ад яго, маўляў, ён пакінуў маю маму, таму што не ўжыўся з цешчай. Ён быў празмерна свабодалюбівы, жыццё ў прымах было не па ім. Хоць яно для яго было непрымальным, але, як прызнаўся мне, маці маю ён любіў. У адведкі да нас у хату на вуліцу Кірава, былую Закасцельную, па чарзе прыходзілі сваякі. Цётка Лена з дзецьмі — шаснаццацігадовым Іванам, чатырнаццацігадовым Сашкам, дзесяцігадовым Мікалаем, васьмігадовай Марыяй — гэта ўсё мае стрыечныя браты і сястра. Дзядзька Іван служыў у войску, стрыечная сястра мамы Соня з'ехала ў Польшчу. Наведваліся стрыечная сястра Ганна і брат Мікалай — гэта сваякі з боку бабы Насці. Мікалай з ахвотаю згадзіўся быць маім хросным, які мне, ужо падлетку, і сказаў, чаму маці назвала мяне Георгіем. Гэта ў памяць хлопца, якога кахала ў школьныя гады і які назаўсёды з'ехаў з бацькамі ў Аргенціну.

У Давыд-Гарадку жыў славуты фатограф Андрэй Зубэй, дзякуючы якому сёння мы маем фотаархіў мястэчка першай паловы дваццатага стагоддзя. Менавіта Андрэй Міхайлавіч зафіксаваў на плёнцы і пажар славутай царквы Узнясення Хрыстова на Царкоўнай гары ў 1935 годзе.

Мама і я разам на фота ад А. Зубэя. На адным фота — мне ўсяго месяцы чатыры-пяць, на другім — я разам з мамай на цвінтары каля Георгіеўскай царквы, і трэцяе фота — у чацвёртым класе група выдатнікаў, сярод васьмі вучняў і я. Яшчэ адно фота — я на ровары перад школаю. Ён жа, Зубэй, пакінуў мне фота мамы, маіх стрыечных братоў, дзядзькоў Івана ды Грыцка з жонкаю Воляй… На жаль, згубіліся назаўсёды фота маладых дзеда Змітра і бабы Насці. Калі я ў чатырнаццацігадовым узросце набыў сабе фотаапарат «Смена», я ўсё ж паспеў іх сфатаграфаваць у старасці. Нейкім чынам цётка Соня даслала маёй маме з Польшчы фота прабабулі з дачкою Мартай і ўнукамі Соняй і Мікалаем. Цяпер я вельмі шкадую, што мала цікавіўся ў сваякоў ды суседзяў жыццём маіх продкаў. Гэта такая хвароба ўсіх падлеткаў: абыякавасць да жыцця старых. Таму і я не ведаю нічога пра свайго прадзеда Рыгора. Крыўдна, што казаць.

Наша хата лічылася добрай, у ёй былі драўляная падлога і сені, праўда, крытая яна была чаротам, а багата ў каго ў нізенькіх з маленькімі вокнамі хатах была земляная падлога. У сенях у нас стаялі аж дзве камоды — наша з мамай і дзедава з яго сынамі. У першым пакоі печ, куток каля печы, у ім драўляны ложак, стол, на ім газавая лямпа, дзедавы варштат з прыладамі, на покуці — драўляная ікона Міколы Угодніка, у вялікім пакоі — грубка, вялікі стол з тоўстымі ножкамі, ложкі дзеда, наш з мамай, ды тапчан бабы каля грубкі. У двары раслі груша-бэра, яблыня, вішня, якая засохла, каля сцежкі — сліва. Трымалі карову, пакуль яна не захварэла. Жыў у будцы руды сабака, ён рэдка бегаў па двары, бо там былі куры, таму яго ўвесь час трымалі на ланцугу.

Рос я слабенькім, і да мяне ўвесь час чапляліся дзіцячыя хваробы. Маці так моцна клапацілася пра мяне, што я доўга быў хатнім дзіцём.

Гарадок стаіць на хуткаплыннай рэчцы Гарынь, якая часценька вясной разлівалася.

…Я сядзеў у дубе, гэта лодка панашаму, і біў дубчыкам па вадзе. Калючы зімовы вецярок прабіраў усё цела… Павяла мяне потым напалоханая маці да доктара, паставілі дыягназ — сухі плеўрыт. Ад гэтага часу, за год да школы, памяць уключылася ў штодзённую работу. Праз дзень маці купіла мяса і смажыла катлеты, якія еў я з вялікай неахвотай, крывіўся, калі мазалі булку маслам, а паверху яшчэ і мёдам. Маці не адыходзіла ад мяне, пакуль я не праглынаў апошні кавалачак. У квяцістым маі быў здаровы і вясёлы.

Мая мама збірала на нашай Асэліцы дзяцей і вучыла нас усіх спяваць тыя песні, якія любіла сама. Гэта «Русская красавица», «Рябинушка». Мне гэтыя ўрокі надакучвалі. Я ішоў у хату, любіў, як казаў дзед, «учыніць якую-небудзь гадасць». Хаваў яго малаток альбо шыла, пасля разам шукалі. Дзед бурчаў і сварыўся на мяне, а баба мяне бараніла. Нарэшце я знаходзіў інструмент, тады дзед мякчэў сэрцам і хваліў.

Першага верасня 1954 года. На агульным фота першакласнікаў разам з намі стаяць і некаторыя бацькі, аднак сярод іх няма маёй маці і майго бацькі. Яны не хацелі сустракацца. Некаторы час маці мяне вадзіла за ручку да самага класа. Я праз пэўны час захацеў хадзіць адзін, цягнула да самастойнасці. Школа, якая месцілася ў былой польскай управе, была адносна недалёка ад нашай вуліцы. Я заўважаў, што некаторы час маці хадзіла ўслед за мной, на адлегласці недзе метраў дваццаці, і непрыкметна назірала за маёй дарогай. Вучыцца мне падабалася. Я не хадзіў у дзіцячы садок, дык невымоўна быў рады апынуцца сярод сваіх аднакласнікаў. Вучоба давалася лёгка, і да пятага класа я быў выдатнікам. У трэцім класе адбыўся мой дэбют на сцэне Дома культуры, які на той час месціўся ў былым касцёле. Можа, з-за таго, што ў мяне былі сапраўдныя скураныя чобаты, якія пашыў мне дзед, кіраўнік самадзейнасці Канстанцін Іванавіч Шапецька ўзяў мяне салістам у танцавальны нумар. Пасадзілі мяне на табурэтку і папрасілі, каб я ўявіў сябе вазніцаю. Мне гэта ўявіць было лёгка, бо наш сусед Знайдзен трымаў каня і часта нас малых катаў па вуліцы. Чацвёра маіх аднакласнікаў-артыстаў абступілі мяне з бакоў і прасілі іх падвезці. «Ванюшенька, душенька, прокати!» Я сурова адказваў: «Не пракачу». Яны зноў настойліва прасілі, і я здаваўся. Пачынаўся танец. З усіх чатырох аднакласнікаў мне найбольш падабалася Святлана Іванова. Сцэна мяне заваражыла, і я пачаў хадзіць у танцавальны гурток, у пятым класе я ўжо саліраваў Раздво (Раство).

Сёмага студзеня. Маці бярэ мяне на рукі і падносіць да акна. Я трапляю ў казку. Перад акном круцяць зорку з дванаццаці ражкоў. На канцах ражкоў — кудасікі, а пасярэдзіне гарыць свечка, за ёй іконка «Нараджэнне Хрыста». Дзядзькі ў кажухах і кучамках спяваюць вітальную нараджэнню Хрыста: «Хрыстос нарадзіўся, Богам хрысціўся. Царыя вітаюць…» Сплю я разам з мамаю. Пытаюся: «Гэта Хрыстос прыносіў нам пад акно зорку?» — «Хрыстос, сыночак. Спі пад зоркаю Хрыста і прачынайся пад зоркаю — і будзеш шчаслівы». Маці часта пачала хадзіць да царквы, спрабавала нават спяваць у хоры пеўчых.

Мяне цягнула на вуліцу, асабліва калі прыйшла вясна, ды маці адпускала з неахвотаю. І я пачаў агрызацца. Маці перайшла спаць у першую палову хаты і спала на голай драўлянай лаўцы галавой да іконы Мікалая Угодніка. Да нас часта пачаў прыходзіць дзядзька Грыша і нешта доўга гаварыў з маці ды бабаю. У маі прынялі рашэнне везці маці паправіць здароўе ў санаторый горада Кіславодск. Яна паехала з неахвотаю і раптам праз чатыры дні нечакана вярнулася дамоў. Яна ў асноўным амаль увесь час сядзела дома альбо тупала па двары, не знаходзячы справы для рук. Восьмага жніўня дзядзька Грыша з жонкаю паехалі на Прыпяць па лазу. Ён абяцаў узяць мяне з сабой ужо некалькі разоў, і гэтым разам мне пашанцавала, ён згадзіўся. Было вельмі рана. Маці мяне пацалавала, дала загорнутыя ў хустачку памідор, агурок, хлеб. «Слухайся ва ўсім дзядзьку Грышу», — сказала на дарогу і перахрысціла. Ехаў я на Прыпяць упершыню. Я ляжаў у лодцы на фуфайках — дзядзька з цёткай Воляй сядзелі на вёслах. Тады, у 1958 годзе, вельмі мала ў каго быў лодачны матор. Я ляжаў і глядзеў у блакітнае неба, на якім там-сям віселі амаль нерухома рэдкія белыя аблокі. Прыпяць уразіла шырынёй і чорнай вадою ў параўнанні з нашай шэрай. Прыцягнулі нос лодкі на пясчаны бераг каля кустоў лазы. Яны спраўна секлі лазу, а я цягаў па дзве-тры штукі да лодкі. Канцы лазы парушалі спакой травы перкі, і яна палахліва шамацела. Мне здавалася, што гэта паўзе да мяне змяя, і я прыспешваў крок, рушыў да лодкі. Далі мне час і павудзіць рыбу. Божа мой, не паспяваў закідваць сваю вуду. Больш за далонь краснапёркі, акунькі, платва так і лезлі на кручок. Дзядзька ад здзіўлення пахваліў: «На Жорыка рыба ідзе. Малайчына!» Да нас, калі мы селі перакусіць, падплыў на маторцы сусед дзядзькі Грышы і нешта яму на вуха сказаў. Мы хуценька сабраліся. Сусед узяў нашу гружаную лазой лодку на буксір, і мы праз нейкія паўгадзіны былі ў Гарадку. Мяне высадзілі на нашым беразе Копанцы. «Ідзі дахаты, я хутка прыйду», — сказаў мне ў дарогу дзядзька. Вяртаўся я героем. Няхай сябры паглядзяць, як трэба вудзіць рыбу, няхай зайздросцяць. На нашай Асэліцы на гурбе калод хлопцы і сядзелі. «Твая маці памерла», — гучна сказаў адзін, на што я спакойна адказаў: «Я ведаю», — і прыспешыў хаду. Жах ахапіў мяне, калі ў промнях сонца здалёк яшчэ ўбачыў у нашым двары века труны. Я напалохаўся, баяўся пераступіць парог. Баба Насця заўважыла гэта, абняла мяне і праз слёзы супакойвала: «Гасподзь забраў тваю маму. Пасля ўсё… пасля. Пабудзь пакуль у цёткі Ганны». Тая якраз выйшла з нашай хаты і, выціраючы ад слёз твар, павяла мяне, узяўшы за руку, да сябе.

# Праз сто гадоў

**Паэт і воін Ігар Мікалаевіч Грыгор'еў, многія гады якога былі цесна звязаны з Беларуссю, з горадам Гарадком Віцебскай вобласці, нарадзіўся ў жніўні. Яго сэрца бязмежна любіла Радзіму, такую, якая ёсць. Ігар Грыгор'еў любіў, не прад'яўляючы рахункаў, прабачаючы памылкі і нават несправядлівасць, заставаўся верны ёй у самыя непрагляданыя дні:**

*Я родине моей не изменял,*
*Безрадостной полынью переполнясь,*
*Я убивался с ней в глухую полночь,*
*Но родине во тьме не изменял…*
(«Перед Россией»)

У гэтым юбілейным годзе протаіерэй Рыгор Грыгор'еў, сын Ігара Мікалаевіча, адшукаў у архівах лісты бацькі і чарговы раз быў узрушаны глыбінёй яго мудрасці і сілай любові. Так што чытачоў яшчэ чакаюць новыя адкрыцці, бо лісты Рыгор Ігаравіч плануе ўключыць у сваю будучую кнігу — доктар медыцынскіх навук і доктар багаслоўя, двойчы прафесар, пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Расіі нядаўна пачаў працу над шматтомным выданнем творчай спадчыны бацькі.

Вялікія мерапрыемствы падрыхтавала да юбілею Пскоўшчына. Паэт Ігар Грыгор'еў родам з вёскі Сітовічы Порхаўскага раёна Пскоўскай вобласці. Сёння вёскі няма, але энтузіястамі (сям'ёй Уладзіміра Васільевіча Васільева (Аўчыннікава), які ведаў паэта асабіста) на месцы Сітовіч усталяваны памятны крыж з таблічкай, дзе напісана, што тут, на Грышыным хутары, 17 жніўня 1923 года нарадзіўся будучы рускі паэт!

У 2017 годзе, дзякуючы намаганням Фонду памяці, Санкт-Пецярбургскага аддзялення СП Расіі, Аляксандра Георгіевіча Скокава, члена праўлення, сакратара СП Расіі, кіраўніка секцыі прозы, а таксама аўтара гэтых радкоў і пскоўскіх пісьменнікаў Уладзіміра Савінава і Андрэя Беніямінава, пскоўскай бібліятэцы на вуліцы Юбілейнай было прысвоена імя Ігара Грыгор'ева. З таго часу бібліятэка вядзе напружаную работу, звязаную са стагоддзем паэта: акцыя «Чытаем Грыгор'ева разам!» (удзел прынялі чытачы з усіх куткоў Расіі, Беларусі і іншых краін), выпуск штомесячных календароў з яго вершамі, слоўнікі па яго кнігах, сустрэчы з людзьмі, якія ведалі Грыгор'ева, збор новых матэрыялаў і, вядома, юбілейны вечар. Па ініцыятыве бібліятэкі (дырэктар Наталля Капаніцкая) транспартнаму прыпынку ў горадзе Пскове на вул. Юбілейнай, дом 87а дадзена назва «Бібліятэка імя Ігара Мікалаевіча Грыгор'ева».

Пскоўскі гісторыка-архітэктурны і мастацкі музей-запаведнік (навуковы супрацоўнік Андрэй Шаршаневіч) падрыхтаваў тэматычную выставу, прысвечаную жыццю і творчасці Ігара Мікалаевіча, з экспанатаў, сабраных раней, а таксама падрыхтаваных Аленай Мільчаковай (жонкай Рыгора Грыгор'ева) і яе сястрой і перададзеных сёлета ў дар музею.

Пскоўскае рэгіянальнае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Расіі (старшыня Ігар Смолькін) таксама адзначыла юбілей спецыяльным мерапрыемствам, бо Ігар Грыгор'еў быў не проста паважаным пісьменнікам, але і адным са стваральнікаў аддзялення і на працягу некалькіх гадоў яго кіраўніком.

Не забыліся на юбілей і беларусы. Нягледзячы на тое, што Гарадок рыхтуецца да сустрэчы гасцей з усёй краіны на XXX Дзень беларускага пісьменства, раённая бібліятэка (арганізатар Вольга Данілава) падрыхтавала вечарыну, прысвечаную юбілею Ігара Грыгор'ева. Паэт шчыра любіў беларускую зямлю і «сяброўпісьменнікаў», якіх шмат перакладаў на рускую мову, яны ж рабілі пераклады яго вершаў на беларускую (Уладзімір Скарынкін, Міхась Пазнякоў, Мікола Шабовіч, Дзмітрый Пятровіч і іншыя). Напрыклад:

*Мой анёл, дарагая сястрыца,*
*Ну, калі мая ноч дагарыць?*
*Мне на рану далонь пакладзіце:*
*Цьма наўкол. Як у цемені жыць?*

*Горкай долі глыток — не бяссмерця*
*Мне б адпіць, свой не песцячы лёс.*
*Мой высокі анёл міласэрны,*
*Ну, няўжо я для смерці ўваскрос?*
(З верша « Боль», пераклад Міколы Шабовіча.)

Твор быў напісаны паэтам у шпіталі, калі ён праходзіў лячэнне пасля чарговага цяжкага ранення.

Паэзія Ігара Мікалаевіча не пакідае абыякавымі паэтаў-перакладчыкаў: яго вершы гучаць на англійскай (Тацццяна Рыжова), балгарскай (Красімір Георгіеў), якуцкай (Сэргэх Сэмэй), чэркескай (Зураб Бямурзаў), украінскай (Вольга Сафра), сербскай (Дэсанка Нінкаў) і многіх іншых мовах.

У 2020 годзе ў Бялградзе была выдадзена кніга «Айчына сэрца цешыць: выбраная паэзія / Ігар Грыгор'еў» — вершы на сербскую мову пераклала Даяна Лазаравіч.



1923-1996

Лёсам і творчасцю паэта і воіна зацікавіўся перакладчык з Сірыі Ібрагім Мухамед Істанбулі. У выніку да стагоддзя Ігара Грыгор'ева выйшаў артыкул пра яго ў вядомым папулярным часопісе «Культурная аш-Шарджа», а вершы на арабскай рыхтуюцца да публікацыі ў конкурсным зборніку «Россия, Россия, Россия на крестном своём рубеже!», які выйдзе да 10 лістапада 2023 г, да навукова-літаратурнай канферэнцыі «Слова. Айчына. Вера» у ІРЛІ (Пушкінскі дом) РАН.

Унучкай паэта, дызайнерам, мастачкай Дар'яй Рыбалтовіч, якая займаецца мастацкім афармленнем кніг Ігара Мікалаевіча і конкурсных зборнікаў, створаны сайт памяці паэта і воіна І. Грыгор'ева, які рэгулярна папаўняецца новымі матэрыяламі. Гэтай работай займаецца Сяргей Саветны (Санкт-Пецярбург), ён жа сочыць за папаўненнем старонкі І. Грыгор'ева на «Стихи.ру». А старонку «ВКонтакте» вядзе пісьменнік Аляксандр Альхін (Масква).

Русістам-лексікографам Анатолем Бясперстых, які жыве ў Наваполацку, на працягу апошніх дзесяці гадоў створаны шматлікія слоўнікі мовы Ігара Мікалаевіча Грыгор'ева.

Не засталіся ўбаку і кампазітары: на вершы Ігара Грыгор'ева яны працягваюць ствараць песні. Прэм'еры некаторых з іх адбыліся ў Пушкінскім доме падчас Грыгор'еўскіх чытанняў, дзе ўдзельнікі з захапленнем слухалі аўтара і выканаўцу Алега Палкіна, заслужанага артыста Рэспублікі Карэлія, кіраўніка хору храма Раства Іаана Прадцечы ў Юках Ленінградскай вобласці, а таксама Таццяну Лапцеву, кампазітара-выканаўцу, выкладчыцу Пскоўскага абласнога каледжа мастацтваў.

Фондам памяці паэта былі выдадзены «Библиографический указатель поэтических произведений Игоря Григорьева» (укладальнік А. Бясперстых) і багата ілюстраваны фатаграфіямі буклет пра жыццё і творчасць І. Грыгор'ева. Акрамя таго, на працягу дзесяці гадоў апублікавана мноства артыкулаў у цэнтральных газетах, літаратурных часопісах, кнігах, а ў зборніку «Только б русскую душу на ветер не пустить — ни про что — в никуда!» (2017) — юнацкая п'еса Ігара Грыгор'ева «У чорныя дні», перапрацаваная драматургам Ягорам Чэрлакам, пераможцам конкурсу 2017 года.

Конкурс узнік на хвалі юбілею дзесяцігадовай даўніны, калі святкавалі 90-годдзе з дня нараджэння Ігара Мікалаевіча. Яго заснавальнікамі сталі Фонд памяці паэта, Пецярбургскае аддзяленне СП Расіі і Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі.

З гэтага юбілейнага года конкурс праводзіцца пад эгідай Саюза пісьменнікаў Расіі пры актыўнай падтрымцы яго старшыні Мікалая Іванова, а таксама выдатных паэтаў Генадзя Іванова і Віктара Кірушына, якія ўжо некалькі гадоў з'яўляюцца членамі журы конкурсу імя І. Грыгор'ева.

За гэтыя гады конкурс праводзіўся ў рознай форме: вочнай, завочнай і вочна-завочнай. Па яго выніках вызначаліся спачатку фіналісты, потым лаўрэаты і, нарэшце, пераможцы. У першы ж год заяўкі паступілі як з цэнтральных рэгіёнаў краіны, так і з самых аддаленых, а таксама з краін блізкага і далёкага замежжа. Конкурсы завяршаліся выданнем зборнікаў з паэтычнымі творамі ўсіх фіналістаў.

Урачыстае ўручэнне ўзнагарод праходзіла на навукова-літаратурных канферэнцыях у ІРЛІ (Пушкінскі дом) РАН у Санкт-Пецярбургу. Па выніках канферэнцый выдаваліся зборнікі «Слово. Отечество. Вера», складзеныя з артыкулаў і тэкстаў дакладаў і выступленняў пісьменнікаў і навукоўцаў.

Самай высокай узнагародай конкурсу стаў памятны медаль «Поэт и воин Игорь Николаевич Григорьев (1923—1996)», заснаваны Фондам памяці паэта да Другіх літаратурных чытанняў у 2015 годзе. Медаль уручаецца пераможцам, а таксама пісьменнікам, літаратурным крытыкам, вучоным, філолагам, журналістам, дзеячам культуры і мастацтва, педагогам за вялікі ўклад у захаванне і развіццё культуры, рускай славеснасці, традыцый патрыятычнага выхавання, а таксама за вывучэнне і папулярызацыю творчай спадчыны Ігара Грыгор'ева. За гэтыя гады высокай узнагароды былі ўдастоены 110 чалавек, а таксама часопісы, выдавецтвы, бібліятэкі.

Адны з першых узнагароджаных — Аляксандр Альхін, пісьменнік і сцэнарыст, які выдаў зборнік вершаў Ігара Грыгор'ева «Перад Расіяй» і падрыхтаваў да выдання яго кнігу паэм, і Міхаіл Усцінаў, пісьменнік і нязменны рэдактар, карэктар усіх выдадзеных за больш чым два дзесяцігоддзі кніг Фонду памяці і Міжнароднага інстытута рэзервовых магчымасцей чалавека, які ўзначальвае Рыгор Грыгор'еў. Сыход М. Усцінава з жыцця аказаўся для нас незаменнай стратай. Менавіта таму зборнікі конкурсаў 2021 і 2022 гадоў не ўбачылі свет асобнымі кнігамі, а ўвайшлі ў склад выдання 2023 года, калі на дапамогу нам паспяшаліся новыя людзі — таленавітыя, спагадлівыя, бескарыслівыя: паэт Аляксандр Лісняк з Варонежа, адзін са складальнікаў зборніка, і філолаг, пісьменнік з Мінска Валянціна Драбышэўская, рэдактар.

***Не забыліся на юбілей і беларусы. Нягледзячы на тое, што Гарадок рыхтуецца да сустрэчы гасцей з усёй краіны на XXX Дзень беларускага пісьменства, раённая бібліятэка (арганізатар Вольга Данілава) падрыхтавала вечарыну, прысвечаную юбілею Ігара Грыгор'ева. Паэт шчыра любіў беларускую зямлю і «сяброў-пісьменнікаў», якіх шмат перакладаў на рускую мову, яны ж рабілі пераклады яго вершаў на беларускую (Уладзімір Скарынкін, Міхась Пазнякоў, Мікола Шабовіч, Дзмітрый Пятровіч і іншыя).***

Рыгораўскія чытанні ў ІРЛІ (Пушкінскі дом) РАН сталі магчымыя дзякуючы намаганням вядучага навуковага спецыяліста, доктара філалагічных навук Аляксея Любамудрава, пісьменніка, члена СП Расіі, які горача адгукнуўся на прапанову аб правядзенні такіх чытанняў у форме канферэнцый «Слово. Отечество. Вера». У гэтым годзе пройдзе ўжо пятая (папярэдняя была арганізавана анлайн у 2020 годзе). У чытаннях 2023 года, як і ў папярэдніх, прымуць удзел вядомыя навукоўцы, а таксама літаратары з Расіі, Беларусі і Сірыі.

На канферэнцыі будуць аб'яўлены вынікі конкурсу «Россия, Россия, Россия на крестном своём рубеже!» Заявак паступіла як ніколі шмат: з Беларусі, Казахстана, Ізраіля, Вялікабрытаніі. Расія ж была прадстаўлена шматлікімі рэгіёнамі: Стаўрапольскім, Краснадарскім, Забайкальскім краямі, Карачаева-Черкесіяй, Башкірыяй, Дагестанам, Татарстанам, Луганскай і Данецкімі рэспублікамі, сталічнымі і абласнымі гарадамі і амаль усімі абласцямі вялізнай краіны.

Журы прыйшлося нялёгка (з Беларусі — А. Аўруцін, М. Пазнякоў, А. Бясперстых). Але з задачай паспяхова справілася. З амаль тысячы вершаў адабраны самыя лепшыя. Парадавалі арганізатараў і журы заяўкі ад юных удзельнікаў, сярод якіх аказалася нямала таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак. У конкурсу ёсць і пастаянныя прыхільнікі, якія дасылаюць заяўкі кожны год, і мы можам назіраць, як у многіх з іх расце прафесійны ўзровень, як яны ўсё больш упэўнена ўздымаюцца да паэтычных вяршыняў.

Кожны конкурс становіцца адкрыццём новых імён. І нам здаецца, што вечная душа Ігара Мікалаевіча гэтым цешыцца асабліва, бо кожнага, хто выяўляў хоць бы найменшую ўвагу да вершатворчасці, ён песціў як дзіця, дапамагаючы абудзіцца літаратурным здольнасцям. Менавіта пра гэта апавядае ў сваім эсэ «Время не властно над памятью», якое ўвайшло ў зборнік, пісьменнік Іван Іваноў-Пскоўскі.

Ігару Мікалаевічу сто гадоў. І ён жывы і будзе жыць, таму што жыве яго сапраўднае паэтычнае Слова!

**Наталля САВЕТНАЯ**
**Фота даслана аўтарам**

# Купрыным і Караленкам заўважаны

Ужыцці ўсякае бывае. Неверагоднага не менш, чым таго, да чаго прывыкаеш. Аднак час бываюць і выпадкі, у якія немагчыма паверыць. Як і гэты, што тычыцца Напалеона. Але ён не з ім адбыўся, а з яго ад'ютантам. У час адной з бітваў, выканаўшы даручэнне імператара, ён на кані галопам вярнуўся з адказам. Аднак, прамовіўшы апошняе слова, нечакана пабялеў, захістаўся ў сядле.



Ангел Багдановіч.

**— Вы ранены? — запытаўся Банапарт.**

**— Даруйце, Ваша вялікасць, я мёртвы, — пачулася ў адказ, і афіцэр упаў на шыю каня.**

«Мне ўспамінаецца гэты аповед, калі я думаю аб апошніх днях і аб смерці Ангела Іванавіча Багдановіча». Гэтыя словы я невыпадкова ўзяў у двукоссе. Не мною яны сказаны, а выдатным рускім пісьменнікам-рэалістам Аляксандрам Купрыным у яго ўспамінах. Аляксандр Іванавіч добра ведаў нашага земляка. Некаторы час і працавалі разам. Неаднойчы мог упэўніцца, наколькі ён быў яркім публіцыстам, крытыкам, рэдактарам.

Багатыя на фактычны матэрыял і «рысы з асабістых успамінаў», як вызначыў жанр сваіх згадак пра Ангела Іванавіча Багдановіча вядомы рускі пісьменнік Уладзімір Караленка. Сам Ангел Іванавіч з захапленнем пісаў пра многіх літаратараў. Гэта відаць са шматлікіх яго публікацый і пасмяротнай кнігі «Гады пералому» (1908). У ёй і ўспаміны Аляксандра Купрына «Памяці А. І. Багдановіча». А працаваў шмат, толькі мала пражыў. Нарадзіўся 14 кастрычніка 1860 года ў Гарадку, памёр 6 красавіка 1907-га ў Санкт-Пецярбургу.

## Журналістыка перамагла медыцыну

Да Максіма Багдановіча ніякіх адносін не мае. Ды і ўвогуле мала пра яго звестак захавалася. Вядома, што ў 20 гадоў стаў студэнтам медыцынскага факультэта Кіеўскага ўніверсітэта. На трэцім курсе далучыўся да нарадавольскага руху. З таварышамі вёў агітацыю сярод моладзі, наведваўся на прадпрыемствы, хацеў адкрыць друкарню. Калі дайшлі чуткі, што зацікавілася паліцыя, вырашыў змяніць кватэру. Аднак у спешцы за куфрам пакінуў часткі шрыфту.

Шмат часу правёў у засценках. Самае страшнае было ў тым, што яму пагражала ледзь не смяротнае пакаранне. Канешне, здзейсненае злачынства на гэта не цягнула. Ды пракурорам Кіеўскага ваенна-акруговага суда быў генерал-маёр Васіль Стрэльнікаў, чалавек вельмі жорсткі. Той самы, якога ў 42 гады застрэліў нарадаволец Мікалай Жалвакоў. Шмат лёсаў зламаў. Выратавала Ангела Іванавіча яго ўдалае выступленне на судзе. Так пранікнёна даводзіў, што за нейкія шрыфты нельга пазбаўляць чалавека жыцця, што яго нават апраўдалі. І ў 1883 годзе выслалі ў Ніжні Ноўгарад.

Каб зарабіць на хлеб надзённы, даваў прыватныя ўрокі. І не пакідаў мары атрымаць медыцынскую адукацыю. Сваімі планамі наконт гэтага падзяліўся з Уладзімірам Караленкам. Увогуле, як сведчыў Уладзімір Галакціёнавіч, «(…) ён любіў даваць медыцынскія парады, выяўляючы пры гэтым веды, якія значна павялічвалі яго ўніверсітэцкі цэнз. Нам усім здавалася тады, што сапраўдным прызваннем Багдановіча была медыцына. Часта ў нас гаварылі, смеючыся, што пры некаторай зласлівасці і здатнасці да інтуіцыі і адгадкі, — з яго калі-небудзь выйдзе новы Захар'ін…» Мелі на ўвазе Рыгора Захар'іна, рускага ўрача-тэрапеўта, заснавальніка маскоўскай клінічнай школы.

Толькі ўсе намаганні прадоўжыць вучобу нічога не далі, але, дзякуючы Уладзіміру Караленку, далучыўся да журналістыкі. Пачалося з таго, што Уладзімір Галакціёнавіч уладкаваўся ніжагародскім карэспандэнтам газеты «Волжский вестник», якая двума гадамі раней пачала выходзіць у Казані. Бачачы, што адкрыўся непачаты край работы, падахвоціў да працы і Ангела Багдановіча.

## «Глядач» бачыў шмат

Як вядома, у любой працы, каб дасягнуць нечага вартага ўвагі, патрабуецца вопыт. Паступова набываў яго і новы газетчык. Уладзімір Караленка сведчыць: «Вельмі хутка ў яго стылі зніклі ўсе сляды нявопытнасці, ён выпрацаваў у сябе сціслую дакладную мову ўзорнага правінцыйнага карэспандэнта, які ў той час па неабходнасці з'яўляўся не толькі рэпарцёрам бягучых з'яў, але і маралістам, правадніком у застылы асяродак вядомых элементарных грамадска-палітычных поглядаў. Пры гэтым напісанае Багдановічам не адрознівалася ні банальнасцю, ні шматслоўем. Неабходную дозу грамадскай маралі ён умеў зводзіць на нейкае кароткае абнаўленне, удалую сентэнцыю, шчасліва ўзятую афарызм любімага пісьменніка».



А. И. БОГДАНОВИЧЪ.

Годы перелома.

1895—1906.

Сборникъ критическихъ статей.

со вступительными статьями Короленко, Куприна и Невѣдомскаго.

Книгоиздательство „Миръ Божій"
СПБ. — 1908 г.

Новымі гранямі талент Ангела Багдановіча раскрыўся з пераездам яго ў Казань. Стаў адным з рэдактараў газеты «Русский вестник», а затым перайшоў у «Казанские вести», якія толькі што адкрыліся. Працы стала болей, але, як для сапраўднага журналіста, якім ён усё больш зарэкамендоўваў сябе, адкрылася і больш шырокае поле дзейнасці. Пашырыліся і тэмы, за якія браўся. Прынамсі, узяўся за напісанне твораў на грамадсказначныя тэмы. Сам псеўданім «Глядач», якім падпісваў гэтыя штотыднёвыя матэрыялы, сведчыць, што поле дзейнасці было шырокае. «Глядач» — не значыць толькі тое, што трапляе пад тэатральныя пастаноўкі ці ўвогуле культурнае жыццё. «Глядач» — гэта ўсё пільна заўважанае і пададзенае з уласнага пункту гледжання.

Пашырылася і яго палітычная актыўнасць. Арганізаваў нелегальную рэвалюцыйна-дэмакратычную партыю «Народнае права». Для яе напісаў праграмны дакумент «Надзённае пытанне», які быў выдадзены брашурай. У 1897-м, знаходзячы ў сібірскай ссылцы, яго ўважліва прааналізаваў Ленін. У артыкуле «Задачы рускіх сацыял-дэмакратаў» ён звяртаў увагу на народапраўленне як на «пераходнае вучэнне, якому нельга не паставіць у заслугу тое, што яно пасаромелася самабытнасці народніцкіх дактрын і адкрыта ўступіла ў палеміку з тымі агіднымі рэакцыянерамі народніцтва, якія перад тварам паліцэйскага класавага абсалютызму дазваляюць сабе гаварыць аб жаданні эканамічных, а не палітычных пераўтварэнняў».

## Часопіс і чытач

Погляды Ангела Іванавіча ў нечым змяніліся, калі перайшоў на пазіцыі «легальнага марксізму». Як вядома, гэта плынь грамадскай думкі, якая з'явілася ў канцы XIX стагоддзя ў Расіі. Арыенцірамі яе сталі творы як самога Карла Маркса, так і тых, хто развіваў ідэі марксізму.

Адпрацаваўшы год у часопісе «Русское богатство», у 1893 годзе перайшоў у «Мир Божий», які з'яўляўся выданнем літаратурным, палітычным і навукова-папулярным для самаадукацыі. Аддаў яму 12 гадоў. І раней, а цяпер тым больш, засведчыў, што належыць да тых журналістаў і рэдактараў, якія ўмеюць цаніць сапраўдны талент. Па словах Аляксандра Купрына, яго заўсёды хвалявала тое, што трапляла пад вызначэнне «наш часопіс» і «наш чытач»: «Яны былі для Ангела Іванавіча рэальнымі, амаль жывымі істотамі. Ім ён аддаў усю сваю душу і аб іх думаў з ранку да вечара, дзеля іх пагаршаў свой насцярожаны недавер выпрабаванага журналіста… Бескарыслівы джэнтльмен, уступчывы ў справах грашовых і выдавецкіх, калі гэта тычылася рэпутацыі і гонару яго сцяга — часопіса».

Калі што не падыходзіла для выдання, вяртаў рукапіс, на кампрамісы не ішоў. Затое вельмі радаваўся чужым поспехам. Пры гэтым кіраваўся не толькі ўласнымі назіраннямі. Стараўся даказаць, які талент важны для літаратуры. Наколькі яго патрабавальнасць значная, відаць па тым, як ставіўся, напрыклад, хоць да гэтых двух пісьменнікаў, розных па таленце, але абодвух вельмі патрэбных літаратуры.

Падыход выяўляецца розны. У першым выпадку прасочваецца месцамі пэўная катэгарычнасць. Сваіх магчымых апанентаў ён не называе, але дапускае, што яны могуць быць. Таму, для падмацавання ўласнай думкі, бярэ іх у свае саюзнікі. Для іншых, разумеючы, што не падтрымаюць яго меркаванне, не шкадуе негатыўных эпітэтаў. У выніку пра Вісарыёна Бялінскага напісаў: «Што б ні адбылося з рускай літаратурай, як бы пышна ні развівалася яна, Бялінскі заўсёды будзе яе гонарам, яе славай, яе ўпрыгожваннем. Па сённяшні дзень яго ўплыў выразна адчуваецца на ўсім, што толькі з'яўляецца ў нас цудоўнага і высакароднага, па сённяшні дзень кожны з лепшых нашых літаратурных дзеячаў прызнаецца, што значнай часткай свайго развіцця абавязаны, Бялінскаму. У літаратурных колах усіх адцэняў наўрад ці знойдзецца пяць-шэсць брудных і пошлых асоб, якія асмеляцца без павагі называць яго імя».




Затое, пішучы пра першыя творы Максіма Горкага, настолькі захоплены імі, што не дапускае меркавання, што нехта можа інакш ставіцца да іх. Падобная ўпэўненасць, пры ўсім іншым, і вынік добрага ведання сучаснай літаратуры. Калі б з'явілася жаданне параўнальнага аналізу, ён бы лёгка змог патлумачыць, чым Максім Горкі вылучаецца сярод іншых творцаў. Але для яго і так было ўсё відавочна, і ён спяшаецца падзяліцца ўражаннямі з чытачом: «У вытанчанай літаратуры апошніх двух-трох гадоў нарысы і апавяданні Максіма Горкага паўсталі ледзь ці не самай значнай з'явай…»

## Душа, закрытая для чужых

Не проста працаваў апантана. Не маючы здароўя, па сутнасці, рабіў гэта на знос. Мела значэнне і яшчэ адна акалічнасць. На гэта таксама звярнуў увагу Аляксандр Купрын: «Цэнзурныя ўмовы і палітычнае мінулае прымушалі Багдановіча хавацца за сціплымі ініцыяламі А. Б. і такім чынам адмаўляцца нават ад таго задавальнення аўтарскаму самалюбству, якое такое нявіннае і зразумелае, а для Ангела Іванавіча было такім заслужаным».

Не пісаць проста не мог. Чаго варты «Крытычныя нататкі», у якіх ярка раскрыўся яго талент. Ён найбольш даваў аб сабе знаць у матэрыялах на грамадска-палітычныя тэмы, напісаных ім, неафіцыйным рэдактарам часопіса. Афіцыйным не мог быць з-за сваёй палітычнай ненадзейнасці. Якімі значнымі былі гэтыя публікацыі, ускосна сведчыць тое, што часопіс «Мир Божий» спыніў сваё існаванне пасля публікацыі яго артыкула пра снежаньскае ўзброенае паўстанне 1905 года.

Праўда, у 1906 годзе, праз два месяцы пасля падаўлення яго, з'явіўся часопіс «Современный мир». Але гэта было ўжо іншае выданне. І таму што блізнюкоў у такой важнай справе быць не можа. Але ў большай ступені па іншай прычыне. Тыя месяцы, што былі адведзены Ангелу Багдановічу Усявышнім, ён знаходзіўся на мяжы жыцця і смерці. Пытанне, зададзенае Аляксандрам Купрыным, так і засталося без адказу: «Ці здагадваўся ён, ці прадчуваў свой блізкі канец? Ніхто з нас не здолее адказаць на гэта, таму што нікога ён не пускаў у сваю закрытую душу. Аднак да апошніх мінут галоўным цэнтрам яго свядомасці, найважнейшым інтарэсам яго жыцця, якое згасала, былі ўсё тыя ж дзве адухоўленыя ў яго вачах істоты — "наш часопіс" і "наш чытач". Ім ён застаўся верны да смерці».

* * *

Праводзілі яго ў апошні шлях 9 красавіка 1907 года. Пахаваны на Волкаўскіх могілках, на ўчастку, што называецца Літаратарскімі масткамі. Сёння гэта музей-некропаль, дзе знайшлі вечны спачын многія рускія, а пасля і савецкія, пісьменнікі, музыканты. Уладзімір Караленка свае ўспаміны заканчвае такімі словамі: «(…) менавіта руская літаратура была сапраўднай радзімай яго душы. Яна дала яму свае радасці і напаіла сваёй гаркотай. З яе асяродка ён атрымаў таксама і сям'ю, і кароткае асабістае шчасце, яна ж рана падтачыла цяжкай працай яго сілы і прывяла да магілы… Каля адкрытай дамавіны, у якой бачылі апошні раз худы твар з сурова завостранымі рысамі, высіліся крыжы, помнікі і бюсты таварышаў, якія прыйшлі раней, і настаўнікаў, рускіх пісьменнікаў, якія прымалі ў свой асяродак новага сабрата. Ён прыйшоў сюды яшчэ маладым, але ўжо паспеў шмат папрацаваць на ніве рускай думкі, у рускім слове, для свабоды, салідарнасці і братэрства». Не лішне сказаць, што і на ніве руска-беларускага літаратурнага пабрацімства.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Выказванне з двух колераў

**Гэтым разам прапануем аматару айчыннага мастацтва сціплы агляд творчасці трох мастакоў. Выбраныя аўтары — ураджэнцы Віцебшчыны, якія з'явіліся на свет у розных вёсачках Гарадоцкага раёна і сталі знакамітымі — у рознай ступені — не толькі ў Беларусі, але і за яе мяжой.**

## Анатоль Кавалёў

Ён нарадзіўся ў вёсцы Даўгаполле ў 1926 годзе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Вядома, што вайна заспела сям'ю Кавалёвых у Гарадку. У пару акупацыі Анатолю Кавалёву з некаторымі родзічамі рознымі спосабамі ўдавалася дапамагаць партызанам. Перад самым вызваленнем Гарадка ў снежні 1943 года будучага мастака забралі ў канцлагер у вёску Заронава пад Віцебскам. Здолеў уцячы — у чэрвені 1944 года ён уступіў у рады Чырвонай Арміі... Былі і бясконцыя франтавыя дарогі, і цяжкае раненне, і ўдзел у штурме Берліна.



*Анатоль Кавалёў «Адкуль мы?».*



*Анатоль Кавалёў «1946 год, на выстаўцы».*

Анатоль Кавалёў скончыў Вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В. Мухінай у Ленінградзе (сёння гэта Акадэмія Штыгліца). Выкладаў у Віцебскім дзяржаўным педінстытуце (цяпер універсітэт імя Машэрава), загадваў кафедрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, малюнка і выяўленчага мастацтва. Быў кандыдатам мастацтвазнаўства, членам Беларускага саюза мастакоў. У 2011 годзе ўзнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Да канца жыцця, якое правёў у Віцебску, не пакідаў працаваць — ствараў. Не стала мастака ў 2015 годзе.

А працаваў Анатоль Кавалёў пераважна ў станковым жывапісе. Натуральна, што тэма вайны стала для яго асноўнай. Хоць апроч тэматычнай карціны ён любіў пейзажы, нацюрморты, партрэты. Яму падабалася адлюстроўваць паўсядзённасць з яе цішынёй, спакоем; мітусню, будзённую, святочную, у яго работах знайсці складана. Анатоль Кавалёў апяваў мір. Здаецца, што месцамі ён ідэалізаваў наваколле, саму рэчаіснасць, але менавіта такім бачыў пасляваеннае жыццё беларусаў, такой жа ўяўлялася яму іх ціхамірная будучыня.

Найбольш вядомыя работы аўтара — «Бацька Мінай» (1980), «Бацькава хата», «З вогненнай вёскі» (абедзве 1986 года), «Сафія Полацкая» (1987), «Позняя восень», «Вёска Даўгаполле» (і адна, і другая 1988 года), «Дарога да Пушкіна» (1992), «Віцебская даўніна», «Зімовая казка», трыпціх «Гімн стараму Віцебску» (усе створаны ў 1996 годзе). Сёння творчасць Анатоля Кавалёва згадваецца рэдка, хоць яго карціны знаходзяцца, напрыклад, у сховішчах Эрмітажа, у фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

## Віктар Шылко

Вядомага ўраджэнца вёскі Зарэчча не стала паўтара месяца таму. Нарадзіўся ён у 1952 годзе. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С. Кірава (зноў жа гаворка пра сённяшні ўніверсітэт імя Машэрава). Быў членам творчага аб'яднання «Квадрат», Беларускага саюза мастакоў. Жыў у Віцебску.

Віктар Шылко не з'яўляўся прыхільнікам рэалістычнай школы — яго цікавілі беспрадметны жывапіс, канцэптуальнае мастацтва. Творца распрацаваў уласную сістэму вобразаў, пабудаваў асаблівыя стасункі са святлом і колерам. Лічыў, што мастацтва павінна хваляваць чалавека, часам нават раздражняць. Для многіх такое вымушанае становішча падавалася няправільным, хтосьці гэтага не прымаў. Аднак калі творца таленавіты, гледачы не абыдуць увагай яго работы. Найбольш вядомыя творы Віктара Шылко — «Памяць пра бацьку» (1976), «Клятва Міная» (1978), «Віцебск» (1979), «Вярнуўся з вайны» (1985), «Апошні трамвай», «Белая карціна», «Ачышчэнне» (усе 1989 года), «Жоўтае і блакітнае» (2000), «Ноч уваходзіць у горад» (2002), «Ландшафт» (2006), «Пакліч мяне яшчэ, мама» (2007), «Чырвоная рама для чорнага квадрата» (2008), «Вызначэнне прасторы» (2008), «Над Дзвіной» (2009)... Большасць з іх адрозніваюць вобразы-асацыяцыі, рытмічнасць, выразнасць фарбаў. Дзякуючы гэтаму творы аўтара здольны выклікаць эмоцыі, запомніцца гледачу.

Аднойчы мастак сказаў: «У мяне ў майстэрні ўвесь час іграе джаз. Я вельмі люблю гэтую музыку, таму што тут музыканты, выкарыстоўваючы ўсяго дзве ноты, могуць ствараць яркія кампазіцыі. Я думаю, у мастацтве тое ж самае — двума колерамі можна сказаць усё. Абсалютна ўсё». Ці паспеў мастак выказаць тое, што хацеў? Ці адбылася цікавая размова з гледачом? Віктар Шылко зрабіў сапраўды шмат, але яго спадчына яшчэ чакае даследавання. Але сам ён лічыў, што тыя ж мастацтвазнаўцы шукаюць і прыпісваюць мастакам стыль, і трэба гэта толькі ім самім: «Бог даў мастаку своеасаблівую ролю ў жыцці — бачыць прыгажосць лепей, чым большасць. Наша роля паказаць гэта гледачам».



*Віктар Шылко «Пачатак пустэчы», 2015 г.*



*Віктар Шылко «Макі», 2018 г.*

## Марыя Ісаёнак

Жывапісец нарадзілася ў 1949 годзе ў вёсцы Кісялі. Вучылася ў мастацкай студыі пры Доме піянераў у Віцебску. Скончыла Мінскае мастацкае вучылішча (сёння Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А. К. Глебава). З'яўляецца членам Беларускага саюза мастакоў. Працуе ў жанры партрэта, нацюрморта, пейзажа. Сярод твораў: «Восеньскія грыбы» (1977), «У новай майстэрні» (1983), «Нацюрморт са шклом» (1989), «Жанчына з бульбай» (1991), «Пахаванне бацькі» (1993), «Жанчына каля акна» (2003). Кожны з іх — вынік пражытага дня, не мастака як творчай адзінкі, а чалавека — як часцінкі вялікага свету.

Большасць твораў Марыі Ісаёнак адлюстроўваюць асаблівую філасофію жыцця. Творца з дапамогай мяккіх, прыглушаных фарбаў, камерных сюжэтаў, стрыманых кампазіцый разважае пра каштоўнасць няспешнасці, заклікае да асалоды, здавалася б, незапамінальным звычайным момантам і, галоўнае, прымушае задумацца пра жыццё і канечнасць чалавечага існавання. Як і многія жывапісцы, Марыя Ісаёнак звяртаецца да адлюстравання стану прыроды, менавіта ў ёй імкнецца адшукаць тыя кропкі, якія дазваляюць разважаць на тэму гармоніі.



*Марыя Ісаёнак «Партрэт у інтэр'еры», 1995 г.*

Сюжэты нібыта прымушаюць настальгіраваць: успамінаць мяккія промні ранішняга сонца на падаконні, пах яблыневага цвету, першы снег на яшчэ не завялых кветках... І людзей побач. Марыя Ісаёнак, відаць, расказвае пра сябе і ўласнае жыццё, але робіць усё так, быццам кожны куточак, які яна апісвае, кожная сцяжынка знаёмыя гледачу з дзяцінства. А ён пагаджаецца на гэтую гульню, рады быць крышачку падманутым, але шчаслівым ад сустрэчы з цудоўным мінулым.

Марыя Ісаёнак часта ў сваіх работах звяртаецца да вобраза жанчыны. Напрыклад, інтэр'ерныя кампазіцыі амаль заўсёды адзначаны адлюстраваннем, напрыклад, маці з дзіцем (найпапулярнейшы архетып) ці аголеной жанчыны (традыцыйна прыгажосць жаночага цела выяўляецца як сведчанне гармоніі ў прыродзе).



*Марыя Ісаёнак «Двор са старой яблыняй у Чарневічах» 2012 г.*

Між тым дагэтуль лёс мастачкі, якая стварае сюжэты пра жанчыну, незайздросны. У звароце да тэмы нават некаторыя крытыкі і, што ўжо не здзіўляе, калегі-жывапісцы бачаць другасначасць, прадузятасць, слабасць — што заўгодна, але не само мастацтва. Творчасць Марыі Ісаёнак калі не пацвярджэнне, то напамін пра гэта. Усё ж найболей папулярныя яе карціны — гэта нацюрморты і пейзажы.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Гарадоцкае хараство

**Якая тонкасць і пяшчота ва ўзоры, што зроблены з нітак, — кісяя, кажуць пра тканіну ў Гарадку на Віцебшчыне. Наш беларускі лён, але глядзіцца так, нібыта гэта тонкія карункі. Трэба ж умець так яго выткаць! А ўмелі здаўна. Можна бясконца захапляцца тым, як беларускія жанчыны працавалі з ільном: рабілі ніткі, потым ткалі, а з тканін выраблялі адзенне, якое ратавала ў спёку і грэла ў холад. У кожным рэгіёне былі свае тэхнікі ткацтва, свае спосабы ўпрыгожыць палатно. І рабілі гэта простыя жанчыны, нашы бабулі, прабабулі і прапра... — ці не ў кожнай вясковай хаце жылі свае майстрыхі. Але цяпер нам хіба што глядзець на іх працу, калі ў каго засталася такая спадчына. Ці ісці ў музей і захапляцца тым, як стваралі раней рэчы для практычнага выкарыстання. Ці паехаць у Гарадок і прайсціся па «Горадзе майстроў», які прапануе азнаёміцца з мясцовымі традыцыямі. Бо ёсць тут руплівыя, якія ў нейкі момант вырашылі: хопіць проста захапляцца, трэба навучыцца рабіць гэтак жа і вучыць іншых. Іх праца — тое ж асветніцтва, толькі сучаснага гатунку.**

Напрыклад, Марына Леанідаўна Гушча вярнула з небыцця мясцовую традыцыю ажурнага ткацтва. І цяпер на Гарадоччыне зноў могуць выткаць вытанчаны ручнік ці абрус з бялюткіх ільняных нітак — і сапраўды не падбярэш для вызначэння найлепшага слова, чым «кісяя». Вядомая майстрыха з'яўляецца загадчыцай Дома рамёстваў і фальклору Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна, у супрацоўнікаў якога асаблівая місія на святе беларускага пісьменства: зачараваць гасцей хараством, якое ствараюць сваімі рукамі. Здолеюць, бо самі зачараваны светам традыцыйных рамёстваў. Хоць усё магло б быць інакш, у прыватнасці для Марыны Леанідаўны, якая мае прафесійную мастацкую адукацыю:

— Я вучылася на мастацка-графічным факультэце ў Віцебскім універсітэце імя П. Машэрава, свой дыплом рабіла па ткацтве. Гэта быў габелен — аб'ёмная работа, мне самой вельмі спадабаўся і працэс, і вынік. У нас на факультэце выкладалі прафесійныя дысцыпліны: малюнак, кампазіцыю, жывапіс... Было і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з практычным навучаннем: макрамэ, ткацтва, аплікацыі з тканін. Таму ў мяне быў вялікі выбар, чым заняцца. Падабалася ўсё, але чамусьці найбольш зацікавіла менавіта ткацтва. Справа ў тым, што мая бабуля, як яе памятаю, заўсёды шыла, вязала. Ды і дзядуля быў мастак па светаадчуванні. Магчыма, ува мне злучыліся і атрымалі працяг здольнасці іх абаіх. Неяк само сабой у маё жыццё ўвайшло ткацтва. Калі размеркавалася на працу, прапанавалі весці гурток, я пагадзілася: 10 дзён дадатковых курсаў у Віцебскім тэхналагічным каледжы — і ткачыха гатова. Галоўнае, каб было жаданне і любоў да працы. І падтрымка блізкіх — без яе наогул немагчыма ў нашай справе. Лічу, што мне моцна пашчасціла ў жыцці, бо мяне ніхто ніколі ні да чаго не прымушаў, не ціснуў. І я рабіла ўсё згодна з уласным адчуваннем. А можа, з Божай ласкі так атрымалася, што ткацтва запала ў душу...

Марына Леанідаўна родам з Магілёўшчыны. Як замуж пайшла, дык і прыехала ў Гарадок, больш за 30 гадоў тут жыве. Ужо лічыць сябе гарадоцкай гаспадыняй. Напэўна, не толькі з-за месца жыхарства. Таму што трэба тут быць душой, удзельнічаць у развіцці, нешта зрабіць для людзей, якія сталі землякамі. Паглыбіўшыся ў мясцовую культуру, яна так шчыра захапілася ёю, што ў нейкі момант зразумела: навык ткацтва трэба пераводзіць у майстэрства. А майстэрства патрабуе дасканаласці. А дасканаласць — вось жа, у вырабах, што захоўваюцца ў мясцовым музеі. У рэчах, якія знайшліся падчас этнаграфічных экспедыцый па рэгіёне: дзе-нідзе яны яшчэ сустракаліся. Натуральна, выспела высnова: трэба паспрабаваць стварыць такое ж хараство.

— Усе тэхнікі па ткацтве, якія я бачыла ў гарадоцкім краязнаўчым музеі ці калі ездзілі ў экспедыцыі, я асвоіла. У кожнай выткала па адным, па два ручнікі. Вельмі спадабалася гэтая праца! Яно ж калі атрымліваецца, то і чапляе найбольш, — прызнаецца Марына Леанідаўна. — Але ажурнае ткацтва, якое найбольш выклікала захапленне, усё пакідала «на потым». Ніяк не магла зразумець, як яго рабіць. А пераняць майстэрства непасрэдна ад носьбітаў было ўжо немагчыма: не засталося нікога, хто б валодаў гэтай тэхнікай.

Лічылася, што традыцыя ажурнага ткацтва беззваротна страчана, таму яе ўнеслі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Але былы дырэктар мясцовага музея Кацярына Ягораўна Уверская яшчэ заспела майстроў, якія ткалі па гэтай тэхналогіі. Яна патлумачыла, як і што рабілі раней. Ды і сама апантаная майстрыха разглядала ўзоры, імкнучыся пралічыць формулу гэткай прыгажосці, створанай рукамі простых жанчын. Але ткацтва зусім не простае. Аднак калі не ўзяцца і не спрабаваць, то і справы не будзе. У 2001 годзе на конкурсе па ткацтве, што адбываўся ў межах «Славянскага базару ў Віцебску», Марына Гушча ўзяла Гран-пры менавіта з ажурным ткацтвам, якое



*Прыклад ткацтва.*

сама ж і здолела аднавіць. Саткала ручнік — ён вельмі спадабаўся камісіі.

Пакрысе больш дасканала асвоіла тры тэхнікі вырабу ажурных рэчаў — адна больш простая, дзве іншыя даволі складаныя. Потым навучыла іншых, каб майстэрства напраўду адрадзілася. Бо яно жыве, калі выкарыстоўваецца больш шырока. А ў 2020 годзе Марына Гушча атрымала прэзідэнцкі грант на развіццё ажурнага ткацтва на Гарадоччыне і аб'яднала групу людзей, якія склалі «кааліцыю вучняў». Тут бы ўзрадавацца, што ёсць і ахвотныя, і неабходная падтрымка. Але гэта быў якраз «пандэмічны» год. Што ж, складанасці выпрабоўваюць рашучасць і загартоўваюць волю. «Сустракаліся» ў інтэрнэце, па мэсэнджарах настаўніца тлумачыла, як трэба працаваць з ільнянымі ніткамі, каб атрымалася вытанчанае палатно.

Лён заказваюць на Аршанскім ільнокамбінаце — спачатку даводзілася і там пераконваць і тлумачыць, для чаго ён патрэбны. Але калі ўбачылі і зразумелі, то частка пытанняў была знята. А цяпер Марына Леанідаўна радуецца, што і на камбінаце сталі вырабляць больш вытанчаныя рэчы. Калі фактура льну спалучаецца з ажурам — гэта дарагога варта.

— Наш беларускі лён я магу параўнаць з шоўкам — ніткі вельмі пяшчотныя становяцца пасля таго, як шмат разоў памыць, каб былі бялюткія, тады ўзоры глядзяцца шыкоўна, — кажа майстрыха. — Праўда, тыя ніткі, з якімі працавалі нашы бабулі, усё ж былі іншага гатунку. Яны лён самі вырошчвалі, трапалі, часалі, пасля пралі кудзелю... У іх ніткі былі тонкія, але таксама не заўсёды роўныя. Але мы прылаўчыліся ткаць, што і ў нас атрымліваецца пяшчота. Ніткі, вядома, рвуцца — як жа без гэтага? Але калі працуе майстар, то яго рука адчувае, якую сілу трэба прыкласці. Прывыкаеш да матэрыялу, да станка, і калі адной сілай прыбіваеш нітку, то яна не рвецца. Як толькі адышоў, мала клопату праявіў да станка — здараецца рознае. Але мы тчэм менавіта тое, што ідзе на выстаўкі, у фонды, на падарункі — стараемся ажурныя вырабы не прадаваць. Прыемна, калі памыеш ручнікі — а яны амаль такой якасці, што і музейныя...

Усё ў яе атрымалася, таму што галоўнае — жаданне асвоіць тэхніку. Тройчы Марыну Леанідаўну запрашалі паказаць ажурнае ткацтва на майстар-класах — у Магілёве і двойчы ў Віцебску, дзе збіраліся ўсе майстрыхі-ткачыхі з вобласці. А літаральна днямі ў гарадоцкім Доме рамёстваў зноў запраўляюць станок: паказваць ажурнае ткацтва падчас святкавання Дня беларускага пісьменства рыхтуецца Наталля Брэус, новая вучаніца майстрыхі:

— ...Але ж у нас не толькі ажурнае ткацтва, усяго чатыры элементы ад Гарадка ўнесены ў спіс дзяржаўных гісторыка-культурных каштоўнасцей: яшчэ спіральнае пляценне, саломапляценне і мясцовыя ўзоры наўнага мастацтва. Усё гэта будзе прадстаўлена на выстаўцы ў павільёне, у тым ліку ажурныя ручнікі. А ў «Горадзе майстроў» пакажуць рамёствы, якімі славіцца Гарадоччына. З радасцю сустрэну гасцей у нашым Доме рамёстваў: будзе прыемна паказаць работы і майстэрні, дзе працуюць творцы, якія вырабляюць сувеніры, займаюцца з дзецьмі, праводзяць майстар-класы. Паглядзець узоры ажурнага ткацтва можна будзе на выстаўцы ў фае Дома рамёстваў, дзе прадставяць усе віды народнай творчасці. А ў «Горадзе майстроў» можна будзе наведаць майстар-клас па ажурным ткацтве, спіральным пляценні, па саломапляценні — у нас ёсць усё, што душа пажадае. На Гарадоччыне падчас даследчыцкіх экспедыцый выявілі 24 віды народнай творчасці. Хочам паказаць усё, што ўмеюць нашы майстры.

Цяпер у Доме творчасці Гарадка працуюць пяцёра вядомых спецыялістаў, якія маюць статус «Народны майстар Рэспублікі Беларусь». Акрамя Марыны Гушчы, гэта Васіль Сіманковіч (лозапляценне, спіральнае пляценне), Тацццяна Міснікава (вышыўка), Людміла Гаравая (спіральнае пляценне, выцінанка), Вольга Рэут (саломапляценне). У Доме рамёстваў разумеюць, што тут валодаюць унікальнымі тэхнікамі і ствараюць вырабы, якія могуць прадстаўляць наогул усю краіну. Так, патрэбны спецыялісты ручной работы. Але ж кожны з майстроў разумее, што іх асноўная мэта — быць асветнікамі. Распавядаць пра сваю творчасць і навучаць майстэрству дзяцей, каб быў працяг і нашым наступнікам больш нічога не спатрэбілася аднаўляць.

Тут працуе 14 гурткоў па рамёствах. Надзвычай складана ў наш час адцягнуць дзяцей ад камп'ютара ці мабільніка. Але ўсё роўна знаходзяцца тыя, у тым ліку сярод моладзі і нават сярод дарослых (гурткі наведваюць людзі з інваліднасцю), хто хоча паспрабаваць стварыць нешта ўласнымі рукамі. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца гурткі па ганчарстве, саломапляценні, лозапляценні, па стварэнні народнай сувенірнай лялькі. Ёсць гурткі, дзе творчасць расцягнута ў часе і не дае хуткага выніку — вышыўка і ткацтва. Тут патрэбны пільнасць і цярплівасць. Згубіў увагу — і нешта пайшло не так (бо вельмі складаныя тэхналогіі). Чаму так і цэніцца ткацтва: рэальна загартоўваецца цярплівасць у чалавека, які хоча гэтым займацца. Дзетак імкнуцца дадаткова заахвочваць, каб яны хоць бы зразумелі, што гэта такое. Як правіла дзеці, якія прайшлі праз такі гурток, больш засяроджаныя, дасягаюць істотных вынікаў: нехта паступае ў каледж на ткацтва, а нехта выпрацоўвае ў сабе цярплівасць, што потым дапамагае ў жыцці. Большасць кіраўнікоў гурткоў маюць педагагічную адукацыю, знаходзяць падыход да наведвальнікаў. Ды і прыцягваюць заняткі, якія праводзяць з душэўнай цеплынёй, з клопатам і пэўнай філасофіяй — была яна ў беларускім жыцці і схавана ў нашых традыцыях.



*Марына Гушча.*

Дзеці, выхаванцы Дома рамёстваў, таксама будуць удзельнічаць у святе — выйдуць на сцэну са сваімі работамі, якія стварылі ў гуртках. Будзе прадстаўлена кампазіцыя стылізаваных строяў, вытканых з аршанскага льну з традыцыйнай вышыўкай — як на «Славянскім базары» ў конкурсе, дзе прадстаўнікі Гарадка сёлета атрымалі другое месца ў намінацыі «Беларускі касцюм». А яшчэ прывезлі дадому два Гран-пры, атрыманыя ў конкурсах па народнай творчасці: за вышыўку і лозапляценне. І за мяжу майстроў з беларускага Гарадка запрашаюць вельмі часта: іх творчасць кранае цеплынёй, якая ўкладзена ў кожную рэч, асабліва адзначаюць менавіта мясцовы «трэнд» — ажурнае ткацтва.

— Гасцям Дня беларускага пісьменства прадставім агульную кампазіцыю, тое, што быццам бы створана адзіным арганізмам. Адна работа стасуецца з другой. Адна без другой не можа жыць, і разам гэта глядзіцца вельмі стыльна і па-сучаснаму. Таму што мы не толькі ствараем, а паядналі мэтай адрадзіць, захаваць і развіць нашу спадчыну, — падсумоўвае Марына Гушча. — Імкнёмся да таго, каб вынікі нашай творчасці знаходзілі месца не толькі ў музеях, але ішлі ў людзі, каб гэтымі вырабамі можна было карыстацца, як калісьці былі ва ўжытку льняныя абрусы ці ручнікі ў хатах нашых папярэднікаў.

Ці не таму яны рабілі цуды з самых простых матэрыялаў, якія былі пад рукой: для сябе ж, дзеля ладу ў побыце і гармоніі ў жыцці. Сапраўды філасофія.

**Ларыса ЦІМОШЫК**
**Фота даслана аўтарам**

# Яго любоў — Куба

**Прызнаваць памылкі не сорамна. Асабліва калі гэта тычыцца не толькі цябе самога, але і іншых, уводзячы ў зман. З гэтым сутыкнуўся і я, пішучы раней нарыс пра першага беларуса, які пабываў на Кубе, Пятра Стральцова. Што ён быў беларусам, сумнявацца не даводзіцца. Прозвішча Стральцоў распаўсюджанае на Магілёўшчыне. А вось калі і дзе ён нарадзіўся, так і не высветліў. Выказаў здагадку, што паходзіў з Быхаўскага ці цяперашняга Слаўгарадскага раёна. Толькі калі мне трапіла ў рукі гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць» Гарадоцкага раёна, даведаўся, што ён родам з Гарадка. Нарадзіўся 1875 годзе. Рана застаўся без бацькі, выхоўваўся ў Гатчынскім сіроцкім інстытуце. У 1896 годзе, пасля заканчэння яго, і падаўся на Кубу, дзе патрыёты на чале з паэтам і рэвалюцыянерам Хасэ Марці 24 лютага 1895 года ўзнялі паўстанне супраць іспанскіх каланізатараў. Пра сваё знаходжанне на гэтым востраве Пётр Платонавіч пакінуў нарыс «Два месяца на острове Кубе», апублікаваным у 1898 годзе і падпісаным крыптанімам П. С-ов.**

## «Сабачыя зубы»

Адправіўся з сынам калежскага рэгістратара Мікалаем Мяленцьевым і студэнтам Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў Яўстафіем Канстанціновічам. Былі валанцёрамі — так у той час называлі тых, хто добраахвотна паступіў на ваенную службу. На параходзе дабраліся да Злучаных Штатаў. У Нью-Ёрку, дзякуючы так званай патрыятычнай юнце, якая з'яўлялася паўафіцыйным прадстаўніком паўстанцаў у ЗША, увайшлі ў склад чарговай экспедыцыі на востраў.

Нямала перажылі прыгод, пакуль ступілі на кубінскі бераг. Сустрэўшыся з генералам Дзіясам, найбліжэйшым паплечнікам аднаго з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчай барацьбы Масэа, з ім накіраваліся да месца, дзе размяшчалася войска Масэа. Трэба было пераадолець усяго шэсцьдзесят вёрст. Не так і шмат, толькі гледзячы дзе. Даліся ім… «сабачыя зубы». Ні кроку — направа, ні кроку — налева. Адно застаецца — рухацца наперад. Ды лёгка сказаць — рухацца. Куды ні ступіш — камяні. Найчасцей такія вострыя, што нагадваюць сабачыя зубы. Ды яшчэ надта «куслівыя». Праз некалькі гадзін ад абутку і следу не засталося. Пайшлі басанож, абразаючы ногі аб камяні. А тут яшчэ ў некаторых кубінцаў пачаліся прыступы жоўтай ліхаманкі. Чалавек нечакана падаў на камяні, пачынаў глуха стагнаць.

Сцяжынка, між тым, стала гліністай. Ад дажджоў гліна прыліпала да ног. З'явілася адчуванне, што хтосьці прывязаў да іх цяжкія гіры. А потым дарога… патанула ў ручаі. Ішлі па калені ў вадзе. Калі сустракалі невялікае азярцо, абысці яго не маглі: наўкол скалы. Сёй-той напорваўся на затанулае дрэва. Спатыкаўся, падаў, моцна лаяўся. Асабліва калі трапляў нагой у схаванае пад вадой бервяно ці корч.

Да лагера дабраліся толькі на пяты дзень. Перад сабой убачылі моцнага складу мужчыну. Масэа выглядаў значна маладзей сваіх сарака васьмі гадоў. Нават не верылася, што ён дваццаць чатыры разы паранены. Праўда, на твары ўжо з'явіліся маршчыны, валасы пасівелі. Паўднёвы клімат хутка старыць чалавека.

## Не проста гармата, а цуд-гармата

За тры месяцы армія Масэа пераадолела з баямі ўвесь востраў. Рашучасці ім надала жорсткасць акупантаў, якая выклікала яшчэ большую нянавісць. Не маглі спыніць іх і «троча» — баявая лінія з фортаў, злучаных траншэямі, якая «перарэзала» востраў на дзве часткі, дасягаючы даўжыні дваццаць чатыры мілі. Флангамі яна ўпіралася ў мора. На гэтым участку размяшчалася іспанскае войска ў шэсцьдзесят тысяч чалавек. Паўстанцаў было ўсяго чатыры тысячы. Камандзір захваёўнікаў Вейлер настолькі напалохаўся іх, што па пятах пусціў свой дзясяцітысячны корпус.

План прарыву Масэ прадумаў яшчэ да прыбыцця валанцёраў. Тое, што назіралася, Пётр Стральцоў у думках параўнаў з вялікім перасяленнем народаў. За воінамі бясконцай чарадой рухаліся сотні старых, жанчын, дзяцей. Уцякаючы ад каланізатараў, яны прыхапілі толькі самае неабходнае. Іх было нават больш, чым саміх паўстанцаў.

Нарэшце ў начной цемры заўважылі контур вялікай гары, дзе размяшчаліся іспанцы. Не паспелі размясціцца на прывал, як наперадзе пачуліся адзіночныя выстралы, якія ператварыліся ў суцэльную пальбу. Але паўстанцы, эканомячы патроны, у перастрэлку не ўвязваліся. Вялікія спадзяванні ўскладалі на сваю адзіную гармату. Гэтая самая сучасная зброя была зроблена амерыканцамі. Выстрал ажыццяўляўся сціснутым паветрам. Пры вялізным ціску снарад вылятаў са ствала і меў моцную разбуральную сілу.



*Пётр Стральцоў (злева).*

Пётр Платонавіч выступаў у ролі кансультанта, сумяшчаючы абавязкі зараднага і наводчыка. Сам наўгад выбіраў цэль. Сам жа зрабіў і першы выстрал. За ім адбыўся другі, трэці… На нейкае імгненне ў лагеры іспанцаў запанавала цішыня. Не заставалася сумнення, што гарматныя стрэлы, хоць і не былі прыцэльнымі, нанеслі праціўніку нямала шкоды. Раздаўся шквальны вінтовачны агонь. Іспанцы стараліся навярстаць упушчанае.

## Рэальнасць — далёка не радасная

Раніцой перайшлі на новую пазіцыю. Выбралі яе так, каб заваёўнікі не нанеслі вялікай шкоды мірнаму насельніцтву. Аднак хтосьці распусціў чуткі, што іспанцы пакідаюць пазіцыі. Многія расслабіліся. Ворагі толькі гэтага і чакалі. Яны ўзмацнілі агонь, асабліва гарматны. Калі пад вечар паўстанцы дабраліся да чарговага населенага пункта, высветлілася, што сорак пяць чалавек выбылі са строю. Адны былі забіты, іншыя — цяжка паранены. Сілы варта было берагчы, бо неабходна пераадольваць «трочу».

Неяк прыйшла Пятру Стральцову думка, ці апраўдана з боку кубінцаў супрацьстаянне такому моцнаму праціўніку: «А што, калі гэтая свабода не акупіцца цаною прынесеных ахвяр? Мне здавалася, што не гэтыя людзі вырашаюць пытанне — быць ці не быць, а хтосьці іншы, і гэты хтосьці — няўмольная сувязь прычын і вынікаў…» Асабліва балюча было ад смерці нявінных ахвяр. Найперш дзяцей: «Каля мяне стаяў нейкі негрыцёнак гадоў дванаццаці і з цікаўнасцю глядзеў наперад, хоць там нічога не было відаць. Раптам ён пачаў усхліпваць, упаў на калені і ўткнуўся галавой у траву. Я пакратаў яго за плячо, думаючы, што ён спалохаўся візгу куляў, якія стаяў у паветры, але хлопчык ужо нічога не баяўся: куля выйшла ў яго паміж лапаткамі…»

З болем сведчыў: «Калі ў Расіі існуюць такія куткі, дзе людзі харчуюцца адной бульбай, дык "поўначы дзікай", магчыма, так і неабходна, між тым, як Куба — багацейшы ў свеце востраў, "перл Атлантычнага акіяна"». Ён любіў Кубу і верыў у яе шчаслівую будучыню. Але чым больш знаходзіўся сярод паўстанцаў, тым больш упэўніваўся ў тым, што яго «далейшае знаходжанне на Кубе — марная трата часу».

Пераканаўся, што яны з сябрамі мала што могуць змяніць. Ды і знаходжанне ў "ролі" артылерыста не прайшло бясследна. Быў паранены ў плячо, а ў Яўстафія Канстанціновіча некалькі цяжкіх раненняў. Мікалай Мяленцьеў ледзьве стаіць на нагах ад ліхаманкі. Разумеў гэта і Масэа.

— Адпраўляйцеся туды, — паказаў наперад, дзе на гарызонце паўставалі горы, ля падножжа якіх бачыліся лугі. — Там шмат і жывёлы, і правіянту.

Здагадаліся, што больш ніколі не ўбачацца. Аднак не прадчувалі, што праз два месяцы Масэа загіне.

## Турма — адпачынак?

Застаўшыся адны, валанцёры па дарозе напаткалі варожы патруль. На допыце афіцэр пагразіў ім хуткай расправай за дапамогу паўстанцам. Інфармацыяй ён валодаў няблага. Значыць, у лагеры знаходзіўся добра замаскіраваны лазутчык. Аднак гэта была толькі пагроза. У карцары, у якім правялі чатыры дні, адносіны былі някепскія. Калі ж іх прывезлі да губернатара, ён нават пацікавіўся, ці няма якіх прэтэнзій. А потым заявіў, што з імі канчаткова разбяруцца ў Гаване.

З Гаваны пераправілі ў крэпасць Маро. У камеры, куды трапілі, з імі было шэсцьдзесят чалавек. Уразіла, што ахова ахвотна бегала ў крапасную лаўку па булачкі, цыгарэты і нават віно для арыштаваных. У камеры былі і свае гандляры. Заўзятыя карцёжнікі, яны, днём зарабіўшы грошы, ноччу іх прайгравалі ў карты.

Вялікай нечаканасцю стала, калі на шосты дзень паліцэйскія звязалі ім рукі і, нічога не тлумачачы, на лодцы адправілі назад у Гавану. За дзень наведалі ці не ўсе паліцэйскія ўчасткі, якія змяняліся дамамі папярэдняга зняволення і турмамі. Пры гэтым, чакаючы вырашэння далейшага лёсу, праводзілі час са зняволенымі.

Пад вечар прывялі да нейкага асабняка. Ім аказалася турма, але такая, умовам утрымання ў якой маглі пазайздросціць простыя смяротныя на волі.

Пасярод пакоя, што нагадваў сталовую, стаяў стол, накрыты белым абрусам з бутэлькамі з пітвом, ляжалі абедзенныя прыборы. Афіцыянты спяшаліся выканаць заказ, бо знаходжанне было загадзя аплачана. Калі валанцёры падсілкаваліся, іх павялі да турэмнага начальства. Яно заявіла, што, паколькі выхадцы з Расіі, іх лёс вырашыць расійскі консул.

Консулам быў француз па нацыянальнасці Труфен. Як ён трапіў на такую адказную і ганаровую службу, заставалася загадкай. Ніколі не бываў у Расіі, размаўляў па-французску. Балазе, Пётр Платонавіч гэтую мову ведаў. Даведаўшыся пра сутнасць справы, заявіў:

— Трэба дадумацца: ваяваць на баку бандытаў, — пасля чаго дадаў, павысіўшы голас: — За такое дома вас па галоўцы не пагладзяць!

Сябры непрыкметна падміргнулі адзін аднаму. Узрадавала, што адказваць давядзецца на Радзіме. Значыць, з Гаваны іх спачатку адправяць у Нью-Ёрк. Сапраўды, ім выдзелілі грошы на білет і дробныя расходы і пасадзілі на параход «Юмуры».

Не паспеў ён кінуць якар, як журналісты на прычале ледзьве не бойку ўчынілі. Кожны хацеў першы ўзяць інтэрв'ю. Стараліся, бо пайшлі чуткі, што прыбываюць кіраўнікі бандыцкіх атрадаў з Кубы. Ім жа не хацелася надта афішыраваць, чым займаліся. Таму ў асноўным адмоўчваліся. Ды журналісты аказаліся людзьмі стрэлянымі. Штосьці пачулі, нешта прыдумалі.

Найбольш пастаралася газета «Нью-Ёрк таймс». Іх прозвішчы буйнымі літарамі вынеслі на першую паласу. Паведамлялася, што гэтыя бандзюгі нанеслі іспанцам вялікі ўрон. Ішлі такія «падрабязнасці», што за галаву хапаліся.

## Не кінуў сябра ў бядзе

Грошай на далейшую дарогу не было, таму тэрмінова ўзяліся шукаць працу. Ды такую, дзе больш плацяць. Пётр Платонавіч з Мікалаем Мяленцьевым уладкаваліся ў порт. Разлічваць на дапамогу Яўстафія Канстанціновіча не даводзілася. Ён, праўда, пакрысе папраўляўся, але не настолькі, каб не баяцца за далейшае жыццё. Абрадаваліся, калі даведаліся, што капітан судна, якое адпраўлялася ў Расію, згадзіўся ўзяць іх падручнымі. Непакоіла толькі, ці перанясе такую далёкую дарогу Яўстафій Канстанціновіч. Аднак і пакідаць яго аднаго не хацелася. Таму Пётр Стральцоў вырашыў застацца з ім. Працаваў на швейнай фабрыцы. Асвоіў працэс прышывання рукавоў да пінжакоў. Атрымлівалася добра, заробкі раслі. Гэта дазваляла купляць сябру дарагія лекі.

На радзіму вярнуўся ў 1898 годзе, пасяліўся ў Віцебску. Працаваў архіварыусам у губернскім праўленні. Потым заняўся журналістыкай. Некаторы час быў галоўным рэдактарам газеты «Витебские губернские ведомости». Карыстаўся псеўданімам Валанцёр, такой была і яго падпольная мянушка. Але трапіў у поле зроку паліцыі. Арыштоўваючы, прыгадалі і знаходжанне на Кубе. Выслалі ў горад Разань. Там займаўся фатаграфіяй, быў дырэктарам друкарні. Ад рэвалюцыйнай барацьбы не адмаўляўся, толькі стаў больш асцярожным. У першых шарэнгах ішоў і ў час Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый.

У Грамадзянскую вайну камандаваў артылерыйскай брыгадай. Дасталася белагвардзейцам ад Пятра Стральцова і на Волзе, і ў Сібіры, і ў Крыме. Застаўся яшчэ ў яго порах у парахаўніцах. Загартоўка на Кубе не прайшла марна.

Апошнім часам жыў у Маскве, працаваў у Маспаліграфтрэсце. На ўсё жыццё запомніў не толькі кубінскія баявыя будні, але і як цяжка жыць без бацькі. Таму, калі рана памерла жонка, пяцярым сваім дзецям быў і бацькам, і маці. Памёр першы беларускі «кубінец» у 1931 годзе.

Апавядаючы пра свой удзел у барацьбе з іспанскімі заваёўнікамі, Пётр Платонавіч назваў сябе «выпадковым авантурыстам». У нечым, магчыма, і так. Аднак пайшоў на гэта дзеля свабоды народа, які любіў.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Праграма Дня беларускага пісьменства

**30 жніўня — 3 верасня 2023 года**
**XXX Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Жыватворным Агнём ад Гроба Гасподняга.**

**2 верасня**

**11.00—22.00 — ФЕСТЫВАЛЬ КНІГІ І ПРЭСЫ: тэматычныя экспазіцыі, прэзентацыі і інтэрактыўныя пляцоўкі ў павільёнах «Гарады — сталіцы Дня беларускага пісьменства»; «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага»; «Кнігі і прэса»; Саюз пісьменнікаў Беларусі; Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Выдавецкі дом «Беларусь сегодня»; Выдавецкі дом «Звязда»; Белпошта.**
*Вул. Савецкая*

**12.00—18.00 — Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Гарадоцкія чытанні».**
*Сярэдняя школа № 2 імя А. П. Сабалеўскага г. Гарадка, Невельская шаша, 16*

**11.00—20.00 — Фестываль народнай творчасці, паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас».**
*Гарадскі сквер, вул. Савецкая*

**11.00—20.00 — Інтэрактыўная пляцоўка БРСМ.**
*Пляцоўка каля райвыканкама, вул. Пралетарская, 2*

**14.00—20.00 — Інтэрактыўная пляцоўка Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі «БРПА — тэрыторыя дзяцінства».**
*Каля гарадскога сквера, вул. Пралетарская*

**11.00—20.00 — Інтэрактыўная пляцоўка Беларускага саюза жанчын.**
*Пляцоўка каля райвыканкама, вул. Пралетарская,*

**11.00—20.00 — Выязное мерапрыемства «Наш абавязак — памятаць!» Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**
*Вул. Валадарскага*

**11.00—20.00 — Пляцоўка рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі «Стужка часу Віцебшчыны».**
*Вул. Савецкая*

**11.00—22.00 — Творчая пляцоўка «Паэтычны партал».**
*Гарадскі сквер, вул. Савецкая*

**11.00—22.00 — Свята славянскіх традыцый «Паўлавы горад».**
*Вул. Савецкая*

**11.00—22.00 — Пляцоўка Музея беларускага кнігадрукавання (г. Полацк).**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, г. Полацк, вул. Вароўскага*

**11.00—22.00 — Выстаўка і інтэрактыўная праграма Музея гісторыі беларускай літаратуры «П. Броўка. Маё XX стагоддзе».**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—22.00 — Пляцоўка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—17.00 — Абласны конкурс «Мір ствараем разам».**
*Пляцоўка каля райвыканкама, вул. Пралетарская, 2*

**10.00—12.00 — Паказальныя выступленні (майстар-класы) па спартыўных кірунках.**
*Спартыўная пляцоўка сярэдняя школа № 1 імя І. Х. Баграмяна г. Гарадка, вул. Пралетарская, 21*

**10.00—12.00 — Таварыская сустрэча па міні-футболе сярод дзяцей да 100-годдзя з дня нараджэння У. Я. Хазанскага.**
*Спартыўная пляцоўка сярэдняй школы № 1 імя І. Х. Баграмяна г. Гарадка, вул. Пралетарская, 21*

**11.00—20.00 — Выстаўка «Мой родны кут» выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П. М. Машэрава.**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, вул Вароўскага, 3*

**11.00—20.00 — Выстаўка «Героі беларускай міфалогіі» (мастак В. Славук, скульптар А. Шпіца).**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, вул Вароўскага, 3*

**11.00—20.00 — «Горад майстроў». Выстаўка ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—20.00 — Выстаўка метадычных матэрыялаў абласнога этапа Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — цэнтр духоўнага асветніцтва і выхавання».**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—20.00 — «Творчы раўнд. Рамесная карусель». Выстаўка народнага клуба ласкутнага шыцця «Рошва» Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур.**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, вул Вароўскага, 3*

**12.00 — Майстар-клас па ласкутным шыцці майстрамі народнага клуба ласкутнага шыцця «Рошва».**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, вул Вароўскага, 3*

**11.00—22.00 — Выстаўка «Кветкавы карагод».**
*Вул. Вароўскага*

**12.00—14.00 — Гала-канцэрт пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка».**
*Гарадоцкі гарадскі Дом культуры, вул. Пралетарская, 4*

**14.00—15-30 — Вечар сямейнага чытання «Бацькоўскі дар».**
*Сярэдняя школа № 1 імя І. Х. Баграмяна г. Гарадка, вул. Пралетарская, 21*

**16.00 — Круглы стол «Турыстычны патэнцыял Гарадоцкага раёна». Прэзентацыя турыстычнага маршрута «Гарадоцкі Парнас».**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, вул Вароўскага, 3*

**17.15 — Эксклюзіўны паказ фільма «На другом берегу».**
*Культурна-асветніцкі цэнтр, вул. Ленінская, 4*

**18.15—18.30 — Прэзентацыя абноўленага гарадскога сквера.**
*Вул. Савецкая*

**18.30—18.45 — Рэканструкцыя гістарычных падзей «Гарадоцкі кірмаш».**
*Вул.Савецкая*

**19.05 — Цырымонія спецыяльнага гашэння памятнага канверта з арыгінальнай маркай, прысвечанай XXX Дню беларускага пісьменства.**
*Вул. Вароўскага*

**19.40 — Урачыстая цырымонія ўскладання кветак да Мемарыяльнага комплексу «Неўміручасць».**
*Плошча імя У. І. Леніна*

**20.00—22.00 — УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЁ XXX ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА. Уручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі.**
*Галоўная сцэна, плошча імя У. І. Леніна*

**3 верасня**

**9.00 — Святочная служба і запальванне Святога агню ў храме, перадача Жыватворнага Агню ад Гроба Гасподняга на лампадкі і свечкі прыхаджан. Пасадка саду малітвы.**
*Храм Святой Жыванachальнай Троіцы, вул. Камсамольская, 14*

**11.00—16.00 — ФЕСТЫВАЛЬ КНІГІ І ПРЭСЫ: тэматычныя экспазіцыі, прэзентацыі і інтэрактыўныя пляцоўкі ў павільёнах «Гарады — сталіцы Дня беларускага пісьменства»; «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага»; «Кнігі і прэса»; Саюз пісьменнікаў Беларусі; Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Выдавецкі дом «Беларусь сегодня»; Выдавецкі дом «Звязда»; Белпошта.**
*Вул. Савецкая*

**11.00—12.30 — Круглы стол «Аб узаемаадносінах літаратуры і выяўленчага мастацтва».**
*Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей, вул. Вароўскага,3*

**11.00—15.00 — Кулінарны фестываль «Мара гурмана».**
*Гарадскі сквер, вул. Савецкая*

**11.00—16.00 — Інтэрактыўная пляцоўка Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі «БРПА — тэрыторыя дзяцінства».**
*Каля гарадскога сквера, вул. Пралетарская*

**11.00—16.00 — Выстаўка і інтэрактыўная праграма Музея гісторыі беларускай літаратуры «П. Броўка. Маё XX стагоддзе».**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—16.00 — Выстаўка ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. «Горад майстроў».**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—16.00 — Выстаўка «Бібліятэка — цэнтр духоўнага асветніцтва і выхавання».**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—16.00 — Пляцоўка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—16.00 — Інтэрактыўная пляцоўка БРСМ.**
*Вул. Пралетарская*

**11.00—16.00 — Свята славянскіх традыцый «Паўлавы горад».**
*Вул. Савецкая*

**11.00—16.00 — Пляцоўка рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі «Стужка часу Віцебшчыны».**
*Вул. Савецкая*

**11.00—16.00 — Інтэрактыўная пляцоўка Беларускага саюза жанчын.**
*Каля райвыканкама, вул. Пралетарская, 2*

**11.00—16.00 — Пляцоўка Музея беларускага кнігадрукавання (г. Полацк).**
*Побач з Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеем, вул. Вароўскага*

**11.00—16.00 — Выстаўка «Кветкавы карагод».**
*Вул. Вароўскага*

**11.00—12.15 — «Мірная, моцная, суверэнная». Літаратурна-мастацкая імпрэза Грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі".**
*Галоўная сцэна, плошча імя У. І. Леніна*

**12.15—12.40 — Узнагароджанне пераможцаў конкурсу «Золотое перо «Белой Руси» — 2023».**
*Галоўная сцэна, плошча імя У. І. Леніна*

**12.40—13.00 — Узнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу «Хвала рукам, что пахнут хлебом».**
*Галоўная сцэна, плошча імя У. І. Леніна*

**14.00—15.00 — ЗАКРЫЦЦЁ XXX ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА.**
*Галоўная сцэна, плошча імя У. І. Леніна*

**18.00 — Эксклюзіўны паказ фільма «На другом берегу».**
*Культурна-асветніцкі цэнтр, вул. Ленінская, 4*

**Праграма мерапрыемстваў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» да Дня беларускага пісьменства 2—3 верасня 2023 г.**

**Месца правядзення: г. Гарадок, Віцебская вобласць**

**02.09.2023 г.**

**Фестываль кнігі**
11.00—19.00

Выстаўка-продаж кніг Выдавецкага дома «Звязда».

Віктарына «Адкажы на пытанне правільна» — атрымай сувенір ад Выдавецкага дома «Звязда».

Прэзентацыя кнігі Уладзіміра Ліхадзедава «Ад Віцебска да Полацка» з серыі «У пошуках страчанага».

Прэзентацыя кніг «Вухуцік», «Палет на Вухуцію», «Па чырвоных стрэлках…» і аўтограф-сесія Кацярыны Хадасевіч-Лісавой.

Прэзентацыя кнігі «Жизнь котёнка Василия, или одна сплошная катаВасия» і аўтограф-сесія Дзмітрыя Нікалаева.

Прэзентацыя кнігі «Кастусь і Міёна» і аўтограф-сесія Віктара Шніпа.

Прэзентацыя кніг «Панч і Чоха» і «Малёк Удалёк і Жах-Рыба» і аўтограф-сесія Жанны Міус.

Прэзентацыя альманаха «Дзвіна. Віцебшчына літаратурная» з удзелам укладальніка Тамары Красновай-Гусачэнкі.

**03.09.2023 г.**

**Фестываль кнігі**
10.00—17.00

Выстаўка-продаж кніг Выдавецкага дома «Звязда».

Віктарына «Адкажы на пытанне правільна» — атрымай сувенір ад Выдавецкага дома «Звязда».

Прэзентацыя кніг «Вухуцік», «Палет на Вухуцію», «Па чырвоных стрэлках…» і аўтограф-сесія Кацярыны Хадасевіч-Лісавой.

Прэзентацыя кнігі «Слаўны працай чалавек» і аўтограф-сесія Міхася Пазнякова.

Прэзентацыя кнігі «Загадка — розуму зарадка» і аўтограф-сесія Уладзіміра Мазго.

Прэзентацыя кніг «Андрэйкава лета», «Дзе была, сарока?» і аўтограф-сесія Іны Фраловай.

Прэзентацыя кніг «Байкальский солнцеворот», «Дверной дом» і аўтограф-сесія Ірыны Карнаухавай.

Акцыі ў рамках Дня беларускага пісьменства ад Выдавецкага дома «Звязда»:

кнігі па 2 руб., 3 руб., 5 руб., 10 руб.;

пры куплі дзвюх і больш кніг — падарунак ад Выдавецкага дома «Звязда»;

«У школу са "Звяздой"» — пры куплі дзіцячай кнігі — у падарунак расклад урокаў і закладка з табліцай множання.

## Маляўнічым штрыхом

# Бітва для героя

**Тых, хто цікавіцца творчасцю таленавітага графіка Фёдара Шурмялёва, новая выстаўка аўтара у A&V Art Gallery не асабліва зацікавіць. Многія творы з часовай экспазіцыі «Міфы Старажытнай Грэцыі» гледачы бачылі неаднойчы — у персанальных і зборных экспазіцыях, на маштабных конкурсах і фестывалях. Тым не менш графіка Фёдара Шурмялёва вартая ўвагі шырокай грамадскасці. Прыемны бонус — уваход у мастацкую галерэю A&V вольны.**

Фёдар Шурмялёў нарадзіўся ў 1991 годзе ў Гомелі. Прайшоў поўны курс мастацкай школы па спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва». Вучыўся дызайну ў Гомельскім дзяржаўным мастацкім вучылішчы, графіцы — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Лаўрэат Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва. Лаўрэат Міжнароднай прэміі СНД «Садружнасць дэбютаў». Магістр мастацтвазнаўства. Член Беларускага саюза мастакоў.

Мастак ад пачатку творчага шляху ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках. Сярод апошніх праектаў — «Асенні салон» і «СССР-100» (Новая Траццякоўка). Да ліку апошніх дасягненняў Фёдара Шурмялёва можна залічыць дыплом за першае месца ў катэгорыі «Графіка» на выстаўцы «Арт-Мінск — 2022» і перамога на Трыенале маладых мастакоў у намінацыі «Графіка». Творы аўтара высока ацаніла журы Міжнароднага біенале літаграфіі (Бялград), якое адбылося ў 2022 годзе.



*«Ясон і Гіпсіпіла», 2020 г.*

Гэта ўсё да таго, што графіка Фёдара Шурмялёва атрымала і міжнароднае прызнанне. Між тым творца ў свой час стаў вядомы за мяжой не дзякуючы графіцы — яго цікавіла анімацыя. Аўтарскі мультыплікацыйны фільм «Жудасны выпадак» стаў лаўрэатам міжнароднага фестывалю ВГІКа. Але пазней зацікаўленні змяніліся…

І вось — новая выстаўка ў даволі камернай галерэі. Чарговы зварот да міфаў Старажытнай Грэцыі. З аднаго боку, тэма займальная і прывабная. Такая прастора для роздумаў, столькі нагод для разважанняў, якая варыятыўнасць у адлюстраванні знакамітых сюжэтаў! З другога боку, справядлівыя пытанні: «І каму патрэбна сёння гэтае пераасэнсаванне? А мо надакучылі гэтыя вечныя міфы? Ці ведаюць іх сучаснікі, ці разумеюць?» Адназначных адказаў быць не можа, хаця ёсць падказка. Калі айчынныя мастакі працягваюць ствараць у гэтым напрамку, значыць, адчуваюць запыт гледача, назіраюць яго невыпадковую цікавасць да тых ці іншых работ і серый, у якія часта такія творы выбудоўваюцца. Добрыя прыклады паказваюць скульптар Сяргей Аганаў і графік Юрый Якавенка. Іх плённая праца са старажытнагрэчаскімі легендамі і міфамі дае выдатны вынік, цікавы і крытыку, і аматару мастацтва.

Чаму ж цікавасць да старажытных сюжэтаў не згасае і ў сучасным свеце? Можа, прычына ў тым, што чалавека заўсёды будзе захапляць далёкі і шмат у чым незразумелы, часам невытлумачальны сусвет? А можа, гэта патрэба ў героі? Міфы Старажытнай Грэцыі якраз і расказваюць пра тое, хто ёсць герой і для чаго ён здзяйсняе свае подзвігі… Для Фёдара Шурмялёва гэтыя сюжэты мелі такое ж значэнне, як і для большасці, хто вывучае сусветную гісторыю і культуру. Між тым ён выбраў для творчых пошукаў менавіта іх, запрасіўшы і гледача паблукаць па лабірынтах старажытнагрэчаскага міфалагічнага светаўспрымання.

Мастак не шукае лёгкіх шляхоў ні ў канцэпцыі (для яго важна, каб думка была складана прадстаўлена), ні ў тэхніцы (апошнім часам звяртаецца пераважна да афорта і літаграфіі). Між тым такую прыхільнасць можна лічыць не вельмі перспектыўнай. Усё ж — можа, нават недзе глыбока ў душы — мастак, тым больш той, хто займаецца ілюстрацыямі да кніг, як Фёдар Шурмялёў, хоча быць пачутым, зразуметым, запатрабаваным. Здаецца, у маладога графіка гэта атрымліваецца, перашкод у стасунках з гледачом няма. Іншая справа, што пакуль ён працуе з арт-кнігай, недаступнай для ўсіх ахвотных.

Відавочна, што ў міфах Старажытнай Грэцыі аўтар шукае дадатковыя сэнсы і прапаноўвае здзейсніць падобнае «падарожжа» гледачу. Нічога надзвычайнага — проста найскладанейшая задача… Між іншым, у гэтага ж гледача можа ўзнікнуць дастаткова наіўнае, дзіцячае пытанне: «Ці варта чакаць серыю Фёдара Шурмялёва, прысвечаную беларускім міфам і легендам?» Хто ведае, магчыма, аўтар некалі да іх звернецца. А пакуль нам застаецца любавацца тым, як арганаўты шукаюць Залатое руна, Персей ратуе Андрамеду, а Ясон змагаецца з драконам.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

---

**зваротная сувязь**

## Не аддавай душу маркоце

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты.

З 1 верасня вяшчальная сетка аднавілася, выхад некаторых перадач спынены, але з'явіліся новыя праграмы.

Сярод навінак звярніце ўвагу на аўтарскі мастацка-публіцыстычны праект Навума Гальпяровіча пра асабістыя сустрэчы з дзеячамі культуры і мастацтва «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты» (у выхадны ў 12.20); на публіцыстычную перадачу Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова» пра тэндэнцыі развіцця сучаснай мастацкай літаратуры (у чацвер у 07.20, 13.15 і 18.45).

Праграма «Літаратурная анталогія» па буднях прапануе старонкі рамана Дафны Дзюмар'е «Рэбэка». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы слухайце твор Івана Шамякіна «Вялікая княгіня». Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе гучаць апавяданні айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» у суботу — вершы Яўгеніі Пфляўмбаўм, а ў нядзелю — творы Ніны Загорскай.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у выхадныя складуць дзве часткі спектакля «Рамэа і Джульета» паводле п'есы Уільяма Шэкспіра.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» слухаць казкі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой пра Вухуціка. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў.

У нядзелю і панядзелак радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з прафесарам, доктарам філалагічных навук Іванам Саверчанкам.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

---

**ЛіМ КАЛЯНДАР**

**4 верасня** 70-годдзе адзначае Леанард Пакульніцкі (1953), беларускі скульптар.

**4 верасня** 70-гадовы юбілей святкуе Кацярына Паплаўская (1953), беларускі жывапісец, графік, кераміст.

**5 верасня** — 105 гадоў з дня нараджэння Пятра Явіча (Іштвана; 1918—2008), беларускага жывапісца.

**7 верасня** — 120 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Кістава (1903—1960), беларускага акцёра, народнага артыста Беларусі.

**8 верасня** — 105 гадоў з дня нараджэння Генадзя Някрасава (1918—1987), беларускага і расійскага акцёра, заслужанага артыста БССР.

**8 верасня** — 100-гадоў з дня нараджэння Розы Гульман (1923), беларускай літаратуразнаўцы, тэкстолага.

**8 верасня** — 85 гадоў з дня нараджэння Анатоля Грачанікава (1938—1991), беларускага паэта, перакладчыка.

**9 верасня** — 105 гадоў з дня нараджэння Сяргея Адашкевіча (1918—2007), беларускага скульптара.

**9 верасня** 70-гадовы юбілей святкуе Іван Абразевіч (1953), беларускі хормайстр, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

**Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ**

---

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Віцебскае абласное аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка, драматурга, сцэнарыста Георгія Васільевіча МАРЧУКА і выказваюць спачуванне яго жонцы, усім родным і блізкім.

Супрацоўнікі выдавецтва «Мастацкая літаратура» смуткуюць з прычыны смерці былога дырэктара «Мастацкай літаратуры» Георгія Васільевіча МАРЧУКА і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці паэта-песенніка Івана Васільевіча ЦІТАЎЦА і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

---

**Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:**

**1 верасня** — у СШ № 10 на ўрок ведаў, які праводзе пісьменніца Іна Фралова. Пачатак у 10.30.

**1 верасня** — у школу № 183 (вул. Герасіменкі, 48) на творчую сустрэчу з пісьменніцай Людмілай Бурдыка. Пачатак у 11.00.

**1 верасня** — у дзіцячую бібліятэку № 10 (пр. Незалежнасці, 123) на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым, прысвечаннаю Году міру і стваральнай працы. Пачатак у 11.00.

**1 верасня** — у СШ № 94 на ўрок ведаў, які праводзе пісьменніца Тамара Бунта. Пачатак у 11.00.

**1 верасня** — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Уладзімірам Мазго ва Упраўленні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па г. Мінску. Пачатак у 15.00.

**6 верасня** — у публічную бібліятэку № 8 імя М. Багдановіча (вул. Даўгабродская, 12) на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым «Маё натхненне — родны Мінск». Пачатак у 12.00.


**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**



**Рэдакцыйная калегія:**
Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер



**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі;
прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк
31.08.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 670

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2081

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12



Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.



ISSN 0024-4686